Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАЧЫ—XV
№ 328 (4234)
Серада, 9 сьнежня
1931 г.
МЕНСК, Савецкая 39

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ. ПЕРАДАВАЯ — Выканаць плян у тэрміны, вызначаныя партыяй (1 стар.). Ю. ЛЕНСКІ. — Аб «пацыфікацыі» да ваенна-палявых судоў (2-я стар.). В. ВОЙНАЎ — Бальшавіцкі адпор сканзыньням лініі партыі (3-я стар.).

НАРЫСЫ. А. МАНЬКОЎ — Воля калектыву (2-я стар.).

Плян здачы збожжа саўгасамі павінен неадкладна быць поўнасьцю выканан. (1-я стар.).

Правільна арганізаваць усе працэсы пераапрацоўкі тэхкультур (1-я стар.).

Спыніць сьвістапляску цэн. (2-я стар.).

Неадкладна прывесьці ў баявую гатоўнасьць сьнегаабарону (3-я стар.).

На партыйнай радзе па мастацтву (4-я стар.).

КІТАЙ. Рада Лігі Нацый згадзілася з усімі патрабаваньнямі Японіі. Новыя баі ў раёне Цзіньчжоу (4-я стар.).

ПАЭШ. На вуліцах Вашынгтону грыміць «Інтэрнацыянал». Пачаўся галодны паход амэрыканскіх беспрацоўных (4-я стар.).

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН У ТЭРМІНЫ, ВЫЗНАЧАНЫЯ ПАРТЫЯЙ

Аб'яднаны лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б патрабаваў «каб у бліжэйшыя дні быў дасягнут карэнны пералом у ходзе загатовак».

У тых раёнах, дзе партыйныя камітэты і ўсе арганізацыі паставілі работу па выкананьні пляну збожжазагатовак на ўзровень палітычнага значэньня гэтай кампаніі, дасягнуты ўжо значныя вынікі.

Паасобныя раёны, як **Сураскі, Уваравіцкі** і інш. ужо поўнасьцю выканалі заданьне, а цэлы рад раёнаў знаходзяцца на ўзроўні 90-95 проц. выкананьня пляну.

Далёка не на ўсіх раёнах разгорнута дзейсная (па справе, а не словах) барацьба з апартуністамі, далёка ня ўсюды кіраўнікі зразумелі неабходнасьць «арганізаваць загатоўкі».

Аб гэтым з найбольшай выразнасьцю гаворыць лічбы. Апошняя пяцідзеўка дала ўсяго 3,1 проц. гадавога пляну, давёўшы агульнае выкананьне яго толькі да 63,6 проц.

Тэмпы збожжазагатовак яўна нездавальняючыя.

Прасоўваньне такімі чарапашымі крокамі можа прывесьці ня толькі да зацяжкі кампаніі, але і да зрыву збожжазагатоўчага пляну. Гэта з усёй адказнасьцю павінны зразумець кіруючыя арганізацыі і, ў першую чаргу, тых раёнаў, дзе злачынна марудна выконваецца плян.

Німа ніякіх апраўданьняў, ніякіх аб'ектыўных прычын для такіх раёнаў, як Старадарожскі (23 проц.), Слуцкі (38 проц.), Пятрыкоўскі (43 проц.), Прапойскі (43 проц.), Камарынскі (42 проц.) і інш., якія ганебна плятуцца ў абозе загатоўчага фронту.

Апартуністычная практыка, патураньне кулаку, буржуазным і кулацка-рвацкім тэндэнцыям, ігнараваньне і пяўменьне паставіць масава-палітычную работу—вось прычыны адставаньня гэтых раёнаў.

Аналізуючы становішча збожжазагатоўчай работы на сэктарох, прыходзіцца рабіць вывад, што як саўгасы, так калгасы і аднаасобны сэктар у сваіх цяперашніх тэмпах работы далёкі ад таго, каб забясьпечыць поўнасьцю і ў тэрмін выкананьне пляну.

Асабліва недапушчальным і найбольш адсталым застаецца саўгасны вучастак. Паводле даных Наркамснабу, па 5 сьнежня саўгасы выканалі 42,4 проц. Прычым, саўгасы Насентрэсту дасягнулі 92,5 проц., Садгародтрэсту—69 проц. Рашаючым-ж у справе загатовак па саўгасным сэктары—Жывёлаводпрамтрэст выканаў толькі 38 проц. пляну.

Ня гледзячы на посьпехі паасобных трэстаў, ня гледзячы на тое, што за апошнюю пяцідзеўку здана 8,3 проц., саўгасы далёкі ад тэй пазыцыі, якую яны абавязаны былі займаць і якая можа задаволіць партыю.

Прычына, бязумоўна, крыецца ў тым, што кіраўнікі адстаючых саўгасаў усё яшчэ забясьпечваюць сябе «на ўсякі выпадак жыцьця». Гэта відаць па прыкладзе раду адстаючых саўгасаў.

ЦК КП(б)Б зьняў кіраўніцтва Белсельтрэсту за праяўленьне апартуністычнай практыкі ў збожжазагатоўках. Гэтыя меры ўжыты партыяй не для таго, каб і далей канстатаваць адставаньне саўгасаў і ў прыватнасьці Жывёлаводпрамтрэсту. З гэтага павінны быць неадкладна зроблены і палітычныя і практычныя высновы як кіраўніцтвам трэстаў, так і паасобных саўгасаў.

Трэба нанесьці руйнуючы ўдар па буржуазных месьніцкіх тэндэнцыях і арганізаваць масы саўгасных рабочых на поўнае і неадкладнае выкананьне загатоўчых пляноў.

Калгасы на 5 сьнежня выканалі толькі 72,3 проц пляну, уключаючы 5 проц. за апошнюю пяцідзеўку. Зразумела, што такімі тэмпамі ні ў якім разе нельга забясьпечыць поўнае выкананьне пляну ў вызначаны ЦК КП(б)Б тэрмін—15-20 сьнежня.

Для таго, каб дабіцца перамог у рамках паказаных тэрмінаў, патрэбна забясьпечыць поўнае выкананьне ўстаноўленых ЦК заданьняў па пяцідзеўках.

Рашаючым у рэалізацыі плянаў загатовак па калгасным сэктары зьяўляецца—масава-палітычная работа і бязьлітасная барацьба з апартуністычнай практыкай, з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі ідэталых калгасьнікаў. Іменна ў гэтым напрамку павінна быць ва ўсю шырыню разгорнута баявая работа партыйных арганізацый, ячэек, сельсаветаў і праўленьняў калгасаў.

Наносячы руйнуючы ўдар па кулаку, выкрываючы і выганяючы яго з калгасу, трэба з большай настойлівасьцю выкараняць кулацкія тэндэнцыі, зрываць маскі з яго агентуры. Гэта павінна знайсьці сваё канкрэтнае выяўленьне ў барацьбе з тымі праўленьнямі калгасаў, якія злосна ўхіляюцца ад выкананьня збожжазагатоўчых пляноў.

Плян збожжазагатовак рэальны. Ён цалкам падтрымліваецца масай калгасьнікаў. Задача заключаецца ў тым, каб па прыкладзе перадавых, найлепш арганізаваць гэтыя масы па выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Асабліва вялікую работу трэба зараз разгарнуць па арганізацыі мас аднаасобнікаў на выкананьне збожжазагатоўчага пляну. Аднаасобны сэктар займае даволі значнае месца ў збожжавым балянсе нашай рэспублікі. А між тым, ён выканаў плян толькі на 59,8 проц. і за апошнюю пяцідзеўку даў прырост усяго 1,9 проц.

У гэтым нізкім процанце прыросту з асаблівай сілай сказваецца апартуністычная практыка, недаацэнка некаторымі раёнамі ролі аднаасобнага сэктару ў збожжазагатоўках, слабасьць масава-палітычнай работы ў радзе раёнаў.

Шмат якія сельскія і раённыя арганізацыі не навучыліся яшчэ змагацца за выкананьне кантрактантамі-аднаасобнікамі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Усе тэрміны прайшлі. Кантрактанты павінны ва што-б там ні стала выканаць свае абавязкі.

Тэрмін спагнаньня цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных элемэнтаў таксама даўно прайшоў. Паасобныя раёны недапушчальна аслабілі націск на кулака, апартуністычна патураюць яму. Бягомльскі раён пры агульным выкананьні пляну на 65,9 проц. цьвёрдых заданьняў спагнаў 2,8 проц., Бялыніцкі адпаведна — 55,9 проц. і 13 проц., Аршанскі — 79,9 проц. і 8,7 проц.

У гэмкае разьвіцьцё масава-палітычнай работы, узмоцнены націск на кулацка-заможныя элемэнты, неаслабная барацьба з праваапартуністычнымі і «лявацкімі» скажэньнямі лініі партыі — у гэтым зараз баявая задача дня.

Партыяй вызначаны цьвёрдыя і непарушныя тэрміны. Задача заключаецца ў тым, каб прывесьці ў рух усе вагары, мабілізаваць усе сілы і забясьпечыць перамогу на гэтым важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

За сваячасовае выкананьне плянаў адказваюць раённыя партыйныя, савецкія і інш. арганізацыі. Ні ў якім разе ня менш, чым раённыя арганізацыі, адказваюць кіраўнікі саўгасных трэстаў, Белкалгасцэнтру, Белкаапсаюзу, Белжывсаюзу, Саюзхлеба і Наркамснабу.

Усе гэтыя арганізацыі павінны прыняць неабходныя меры для поўнага выкананьня плянаў збожжазагатовак.

Правільна арганізаваць усе працэсы пераапрацоўкі тэхкультур

Па прыкладу перадавых калгасаў Мсьціслаўскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў змагацца за выкананьне і перавыкананьне плянаў загатовак

Як калгас „Ударнік" дабіўся посьпехаў

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. У калгасе «**Ударнік**», Даўгавіцкага сельсавету, на 25 лістапада ўвесь лён апрацаван і валак но ў колькасьці 16 цэнтн. здана дзяржаве.

Як калгас дабіўся такіх посьпехаў?

У калгасе былі толькі 3 ручныя ільнамялкі. Праўленьне так арганізавала працу, што мялкі былі нагружаны поўнасьцю. Для гэтага быў складзен каляндарны плян, па якім за кожны дзень трэба было даваць 1,5 цэнтн. валакна. Былі складзены спэцыяльныя брыгады сушыльшчыкаў, мяльшчыкаў і трапальшчыкаў. Кожная брыгада атрымала асобнае заданьне, над выкананьнем якога і працавала ўвесь час.

Адну мялку абслугоўвалі дзьве сушылкі. Гэта давала магчымасьць арганізаваць бесьперабойную работу мялак. Ільнамялкі былі расстаўлены так, каб наймепш часу траціць для перавозкі іх ад сушылкі да сушылкі.

На працягу ночы сушылася траста, а ўдзень яе мялі. Адразу-ж пасьля гэтага трапалі лён. Трэба адзначыць, што нормы для трапальшчыц былі ўстаноўлены параўнальна нізкія—120 жмень, або 6-7 кгр. на дзень. Трапальшчыцы **Цупікава Марыля** і **Дуксіна Марыля** сыстэматычна гэтыя нормы **перавыконвалі** і за дзень абтрапвалі 12 і больш кгр. валакна. Гэтыя трапальшчыцы за добрую якасьць трапаньня прэміяваны

У часе апрацоўкі ільну шырока было разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Правільная арганізацыя працы і сыстэматычнае кіраўніцтва апрацоўкай з боку праўленьня калгасу забясьпечыла посьпехі ў выкананьні пляну загатовак.

Г. С.

Прыклад узорнага выкананьня абавязкаў перад дзяржавай

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Старасельскі сельсавет, сваячасова ўключыўся ў месячнік пераапрацоўкі і загатовак тэхкультур, па-бальшавіцку правёў гэту работу.

Дзякуючы правільнай арганізацыі працы, увядзеньню прагрэсыўна-прамёўнай зьдзельшчыны, разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва, **калгасы свае абавязкі перад дзяржавай выканалі.**

На 4 сьнежня дзяржаве здана 650 цэнтн. валакна замест 638 цэнтн., або **101,8 проц. пляну.** Па аднаасобным сэктары плян загатовак выкананы на 91,2 проц.

Зараз працуем над выкананьнем **сустрэчнага пляну** па ільназагатоўках **у 65 цэнтн.**

Плян загатовак ільнянога семя ў Старасельскім сельсавеце таксама выкананы **на 214,5 проц.**

Сакратар ячэйкі КП(б)Б **Раманішкін.**
Старшыня сельсавету **Васільлеў.**

УМЕЛА РАССТАВІЛІ СІЛЫ

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. Калгасы Буда-Кашалёўскага раёну з посьпехам ідуць да перамогі ў выкананьні важнейшай палітычна-гаспадарчай задачы — пераапрацоўкі і загатовак тэхкультур. Гэта работа з асаблівым посьпехам разгарнулася за апошнія дні.

Раённы плян па калгасах на 5-га сьнежня выкананы на 71 проц.

Рад калгасаў поўнасьцю ўжо скончыў пераапрацоўку, перавыканаўшы ільны загатовак.

Калгас **імя Леніна,** Дуравіцкага сельсавету, замест 14,5 цэнтн. валакна па пляне, здаў дзяржаве 17,64 цэнтн., або 121,6 проц., калгас **імя Калініна** замест 5 цэнтн. здаў 9, або 180 проц.; калгас «**Шлях да сацыялізму**» замест 7 цэнтн. — 10 цэнтн., або 143 проц.; «**Камунар**» № 1 замест 6 цэнтн. — 10,4 цэнтн., або 173,3 проц.; «**Чырвоны партызан**» замест 5 цэнт. — 11 цэнт., або 220 проц.; калгас «**Перадавік**» замест 15 цэнтн. — 16,6 цэнтн., або 110,6 проц.

Рэшта калгасаў таксама ўдарнымі тэмпамі праводзіць апрацоўку.

Чым тлумачацца гэтыя посьпехі? **Вялікую ролю ў паспяховай працэсаў пераапрацоўкі ільну адыграла выдача авансаў калгасьнікам і калгасьніцам як у грашовым выглядзе, так і прамтаварамі.** На пераапрацоўку ільну выходзяць усе жанчыны. **Ясьлі,** якія ўжо меркавалі зачыняць, бо ня было дзяцей, **зараз перапоўнены.**

У значнай частцы калгасаў праца праходзіць **у 2 зьмены;** ноччу працуюць пры ліхтарох, напр., калгасы «**Інтэрнацыянал**», **імя Дзяржынскага, Леніна, Сталіна, «Камунар»** і інш.

Па сушцы, мяцьці і трапаньні ільну складзены спэцыяльныя брыгады. Да кожнай мялкі прымацаваны 2 брыгады, якія працуюць пазьменна; для сушкі ільну прыстасаваны па 2 ёўні на мялку (ручную).

Калгасы Буда-Кашалёўскага раёну паказваюць прыклад сацыялістычнай узаемадапамогі. Так, калгас **імя Сталіна** вылучыў брыгаду з 25 чал. на дапамогу нацыянальнаму калгасу «**Гохфэнунг**», калгас «**Красін**» на дапамогу калгасу «**Інтэрнацыянал**» вылучыў 18 чал. і г. д.

Узаемадапамога паміж калгасамі адбываецца на ўмовах гаспадарчага разрахунку. Калгасьнікам, якія працуюць у парадку дапамогі, залічваюцца працадні ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці выпрацаванай прадукцыі, таксама пароўні з мясцовымі калгасьнікамі выдаюцца грашовыя авансы і 50 проц. прамтавараў. Правільная арганізацыя работы, умелая расстаноўка сіл, буксір адстаючых — вось што выратае посьпех.

Прыклады калгасаў Буда-Кашалёўскага раёну вучаць, як трэба арганізоўваць барацьбу за лён. **А. Мікуцкі.**

Сушка, мяцьце і трапаньне--важнейшыя этапы барацьбы за лён

ВІЦЕБСК. Апрацоўка і загатоўкі ільну па Віцебскім раёне праводзяцца недапушчальна марудна. Пяцідзеньнік генэральнай праверкі належнага пералому ня даў. Плян загатовак выканан **толькі** на 16 проц.

Прычына маруднага разгортваньня загатовак заключаецца ў адставаньні апрацоўкі. У калгасным сэктары на 1.320 гэкт. лён прамят з 477 гэкт., у аднаасобным—651, прамят толькі з 197 гэкт. Адстае і трапаньне. З усяго памятага ільну ў калгасах пратрапана з 274 гэкт. і ў аднаасобным сэктары—110 гэкт.

Зусім недапушчальна праходзяць загатоўкі па Міхалеўскім і Даўжанскім сельсаветах. Так, **у Міхалеўскім** сельсавеце калгасны сэктар плян ільназагатовак выканаў на 9,4 проц., аднаасобны-ж—нічога ня здаў на загатоўчыя пункты.

Даўжанскі сельсавет, замест прыняцьця рашучых мер па пераапрацоўцы і загатоўках, стаў на шлях зьмяншэньня пляну. Так, аднаасобны сэктар павінен быў здаць (прадаць) дзяржаве 5 тон ільнавалакна паводле пляну, а сельсавет гэта заданьне зьменшыў да 1,52 тоны. Стаўшы на **апартуністычны** шлях зьмяншэньня пляну, сельсавет ганебна зрывае загатоўкі: ільнавалакна загатоўлена 4,1 проц.

На Даўжанскім сельсавеце і гэта надзвычай характэрна, няма націску на кулацка-заможную частку гаспадарак. Па цьвёрдых заданьнях замест 408 кгр. ільну здана толькі 100.

А. З.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

ПЛЯН ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА САЎГАСАМІ

ПАВІНЕН БЫЦЬ НЕАДКЛАДНА ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАНАН

Прывесьці ў рух усе вагары. Мабілізаваць шырокія масы саўгасных рабочых на барацьбу супроць буржуазных, рвацкіх тэндэнцый, за сваячасовую рэалізацыю заданьняў па збожжазагатоўках

Аб'яднаны лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б даў катэгарычную дырэктыву аб «**абавязковай здачы саўгасамі вызначаных плянам загатовак працуцыі не пазьней 10-га сьнежня**».

Такім чынам засталіся **два дні** да сканчэньня тэрміну рэалізацыі саўгаснымі сыстэмамі пляну збожжазагатовак. Між тым даныя аб ходзе здачы таварнага збожжа саўгасамі сыгналізуюць рэальную пагрозу невыкананьня заданьняў у тэрмін.

На 7-га сьнежня гадавы плян збожжазагатовак **па саўгасах усіх сыстэм** выканан у сярэднім толькі на 50,9 проц. Толькі сыстэма Насентрэсту набліжаецца да поўнай рэалізацыі саўгасных заданьняў, выканаўшы да 7-га сьнежня 92,5 проц. гадавога пляну.

Рэшта-ж саўгасных трэстаў недапушчальна **адстае.** Буйнейшы збожжаздатчык — сыстэма **Белжывёлпрамтрэсту** — ганебна цягнецца ў хвасьце загатовак. Замест 20.476 цнт. збожжа, вызначаных плянам, здана толькі 7.774 цнт., або 38 проц. Сыстэма **Садова-гароднага** трэсту выканала заданьне на 69 проц., **Сьвінаводтрэсту** — на 39,4 проц., **Птушкатрэсту** — на 59 проц.

9 сьнежня

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што саўгасныя сыстэмы БССР усё яшчэ працуюць па-старому, не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з галоўнымі задачамі, пастаўленымі партыяй і ўрадам. Матар'ялы брыгады «Зьвязды», якія мы сёньня зьмяшчаем, паказваюць, што спадчына былога апартуністычнага кіраўніцтва Белсаўгастрэсту дагэтуль яшчэ не ліквідавана, што **новае** кіраўніцтва саўгасных сыстэм, у прыватнасьці Белжывёлпрамтрэсту, не павярнуўся тварам да збожжазагатовак, да забесьпячэньня поўнага і сваячасовага выкананьня плянаў здачы таварнай прадукцыі.

У радзе саўгасаў усё яшчэ ня зжыты буржуазныя, месьніцкія тэндэнцыі, апартуністычныя спробы затрымаць збожжа ў сябе «на ўсякі выпадак», пакінуць як можна больш прадукцыі для ўласных рвацкіх патрэб.

Саўгасная сыстэма абавязана **неадкладна** дабіцца карэннага пералому ў ходзе здачы збожжа. Баявая задача партыйных, прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый саўгасаў — ва што-б там ні стала забясьпечыць ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі, дабіцца выкананьня заданьняў па збожжазагатоўках.

На мёртвым пункце

З часу апублікаваньня пастановы ЦК КП(б)Б аб загатоўках і зьмены былога апартуністычнага кіраўніцтва Белсаўгастрэсту прайшло ўжо каля паўтара месяца. Тэрмін зусім выстарчальны для карэннай перабудовы работы, арганізацыі сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў здачы збожжа саўгасамі.

Аднак, кіраўніцтва Белжывёлпрамтрэсту ўсё яшчэ не пераключылася на рэйкі баявога ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду, аб выкананьні пляну збожжазагатовак. На 7 сьнежня сыстэма Белжывёлпрамтрэсту выканала заданьне **толькі** на 38 проц.

З 54-х саўгасаў, якія атрымалі заданьні па збожжазагатоўках, **23 дагэтуль не здалі дзяржаве ні аднаго цэнтнэра збожжа.** Кіраўніцтва трэсту адносіцца прымірэнча да яўнага ігнараваньня гэтымі саўгасамі сваіх заданьняў і ня прымае патрэбных мер у адносінах да дырэктараў, якія злосна зрываюць здачу збожжа.

Яшчэ больш: кіраўніцтва трэсту ў асобных выпадках патурае рвацкім, месьніцкім тэндэнцыям кіраўнікоў некаторых саўгасаў і беспадстаўна зьмяншае вызначаныя ім заданьні. Так, саўгасу «Прафінтэрн» з 987 цэнтн. збожжа плян памепшан да 220 цэнтн., саўгасу **Завальчыца** — з 740 да 300 цэнтн. А саўгасы «**Гарнізўшчына**» і «**Войкава**» зусім вызвалены ад здачы збожжа.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што спадчына былога апартуністычнага кіраўніцтва Белсаўгастрэсту яшчэ канчаткова ня вытручана з практыкі работы саўгасных сыстэм.

Тэмпы здачы збожжа саўгасамі Белжывёлпрамтрэсту **злачынна марудныя.**

Паводле дырэктывы партыі і ўраду, саўгасы павінны поўнасьцю выканаць плян збожжазагатовак не пазьней 10 сьнежня. Для гэтага патрэбна штодзенна здаваць збожжа ў колькасьці ня менш 8-10 проц. гадавога заданьня. Між тым, за апошнюю пяцідзеўку лістапада штодзенны прырост складаў у сярэднім **толькі** 3,7 проц. гадавога пляну, а за 1-га і 2-га сьнежня — **яшчэ менш** (1,5 проц.).

Неабходна зараз-жа рашуча перабудаваць работу Белжывёлпрамтрэсту, пераключыць яе цалкам на барацьбу за поўнае выкананьне саўгасамі заданьняў па здачы збожжа.

Брыгада «Зьвязды»:
А. Бажкоў, Захарэнка.

„Збожжазагатоўкі--справа дырэкцыі"

СЛУЦАК.

Саўгас «**Бранчыцы**» ў выніку дрэннай арганізацыі працы недапушчальна зацягнуў абмалот збожжавых культур. Дырэкцыя саўгасу, замест таго, каб разгарнуць баявыя тэмпы абмалоту і здачы збожжа дзяржаве, прытрымліваецца тэорыі «чарговасьці кампаній», адкладвае гэту работу з тыдню на тыдзень.

Гэты апартуністычны спакой прыводзіць да зрыву заданьня. На сёньнішні дзень саўгас здаў дзяржаве збожжа толькі 50 проц. пляну. Зараз дырэкцыя саўгасу **зусім спыніла здачу збожжа.**

Паўстае пытаньне — што робяць партыйная, камсамольская ячэйкі саўгасу і рабачком?

Гэтыя арганізацыі зусім ня цікавяцца збожжазагатоўкамі, лічаць іх «справай дырэкцыі». Паасобныя партыйцы, замест барацьбы за здачу таварнай прадукцыі дзяржаве, займаюцца разважаньнямі аб «пераэльнасьці пляну», падтрымліваюць месьніцкія, буржуазныя тэндэнцыі кіраўніцтва саўгасу.

Белжывёлпрамтрэст павінен прыняць самыя рашучыя меры.

Я.

Яравы клін пасеўнай забясьпечыць насеньнем кармовых траў

Загатоўкі ў аднаасобным сэктары—на поўны ход

Пачаць абмалот насеннай канюшыны

КРУПКІ.

Згодна вызначаных тэрмінаў НКЗБ загатоўкі насеньня павінны быць скончаны да 1 студзеня 1932 году. Аднак, загатоўчыя арганізацыі Крупскага раёну замест таго, каб павесьці разгорнутую кампанію загатовак насеньня кармовых траў, бязьдзейнічаюць.

На 5 сьнежня загатоўлена 15 цэнтн. насеннай вікі, замест намечаных плянам 623 цэнтн.; лубіну трэба загатовіць 575,2 цэнтн.; загатоўлена 2 цэнт.; насеньня канюшыны, якое трэба загатовіць 110 цэнтн., а таксама і сэрадэлі не загатоўлена ні аднаго кілё.

Раённыя зямельныя і загатоўчыя арганізацыі не мабілізавалі масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў — бедняцкую і серадняцкую — на сваячасовы абмалот і загатоўку насеньня кармовых траў. Райза і райкалгассаюз справай загатовак насеньня зусім не займаюцца. Загадчык райза тав. **Васілевіч** на запытаньне, што зроблена па загатоўках насеньня кармовых траў, адказаў: «Гэту справу ў нас праводзіць райснаб , і што зроблена — я ня ведаю». Райснаб у сваю чаргу таксама нічога ня робіць. Бестак аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак ні ў райза, ні ў райснабе няма. Райкалгассаюз пры штаце 13 інструктароў ня ведае, ці даведзена заданьне па загатоўках насеньня да кожнага калгасу. На запытаньне, чым тлумачыцца такі нізкі процант выкананьня пляну загатовак, аграном-плянавік райкалгассаюзу адкрыта прызнаўся: «Нас да гэтага часу за загатоўкі насеньня кармовых траў ня лаялі і таму мы нічога ня робім».

Пляны загатовак да сельсаветаў даведзены толькі ў лістападзе. Частка сельсаветаў ня ведае, якімі арганізацыямі праводзяцца загатоўкі насеньня.

Ня гледзячы на пастанову НКЗБ аб забароне памолу вікі, крупскі райкамбінат толькі 1 сьнежня разаслаў адносіны па млынох аб выкананьні гэтай пастановы і забароне памолу вікі.

Вельмі дрэнна праходзяць загатоўкі ў аднаасобным сэктары. Паводле пляну трэба загатовіць вікі 367 цэнтн., канюшыны — 67 цэнтн., лубіну — 357 цэнтн., а загатоўлен толькі... 1 цэнтнэр лубіну.

У выніку бязьдзейнасьці загатоўчых і зямельных органаў раёну у радзе сельсаветаў (Халопеніцкі, Рыцкоўскі) насеннай канюшынай кормяць жывёлу.

РК КП(б)Б і РВК павінны палажыць канец бязьдзейнасьці загатоўчых арганізацый і дабіцца неадкладнага пералому ў загатоўках насеньня кармовых траў. На працягу сьнежня плян загатовак павінен быць выканан поўнасьцю.

С. БАРЫСЕВІЧ.

Упаўнаважаны, які нічога ня робіць

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. Для кіраўніцтва загатоўкамі насеньня ў Чырвона-Слабодзкім раёне арганізавана насенкантора. Вылучан упаўнаважаны. Але ўпаўнаважаны насенканторы па працягу 3-х месяцаў нічога ня робіць.

Да 1-га сьнежня ў Чырвона-Слабодзкім раёне да загатовак насеньня не прыступілі і ні аднаго кілё не загатоўлена.

Л. Я.

107 дзён пад сукном

ПАРЫЧЫ.

Белканторай Насеннаводсаюзу яшчэ 18 жніўня быў прысланы плян загатовак насеньня ў Парычы. Між тым плян яшчэ не даведзен да здатчыкаў.

Белканторы прышлося паслаць у Парычы чатыры тэлеграмы з патрабаваньнем тлумачэньня, як ідзе ход загатовак насеньня збожжавых культур і насеньня траў. Толькі на апошнюю адказалі, што «мы пляну ад вас не атрымалі і па загатоўцы насеньня нічога не рабілі».

Пры абсьледваньні ўпаўнаважаным ЦК КП(б)Б і СНК выявілася, што плян быў атрыман у жніўні і ляжаў да гэтага часу ў райземчастцы, нікім не разгледжаны.

Бюракраты з Парыцкага райза павінны быць сурова пакараны за нядбайныя адносіны да важнейшай кампаніі.

Л. ЯГОР.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Новы завод па вырабе агнятрывалай цэглы

МЕНСК. (БЕЛТА). У першым квартале 1932 г. ля разьезду Сьветазар, Чавускага раёну, пачнецца пабудова заводу па вырабе агнятрывалай цэглы. Завод будзе выпускаць 15.000 тон цэглы ў год. На будаўніцтва адпушчана 600.000 руб. Белторфу даручана загатовіць 15.000 тон торфу для патрэб заводу.

Скарыстаньне апілак у якасьці сырцу

СУРАЖ. Дырэктар кардоннай фабрыкі імя Вароўскага тав. **Сьцепановіч** унёс каштоўную прапанову аб скарыстаньні драўняных апілак у якасьці сырцу. Папярэднія вопыты далі добрыя вынікі.

Скарыстаньне апілак прынясе да 30 тыс. руб. эканоміі ў год.

Фабрыка „Камінтэрн" дабілася пералому

На працягу апошніх месяцаў гомельская швейная фабрыка «Камінтэрн» сыстэматычна ня выконвала прамфінпляну. За 25 дзён лістапада, напрыклад, праграма была выканана толькі на 88,5 проц.

Грамадзкія арганізацыі фабрыкі сумесна з адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам правялі штурм. Дзякуючы выразнаму кіраўніцтву парткалектыву і фабкому, грамадзкаму буксіру лепшых пэхаў пад адсталымі, ажыцьцяўленьню сустрэчнага пляніраваньня, давядзеньню заданьня да кожнага рабочага, баявой работе фабрычнага друку, —удалося дабіцца пералому. За апошнюю пяцідзеўку лістапада праграма выканана на 104,7 проц. Адстаюць яшчэ два цэхі — пінжачна-суконны і пінжачна-папяровы.

Замена дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў

Па беразе Заходняй Дзьвіны, за 10 клм. ад Віцебску, у мясцовасьці Вярхоўе, пабудован невялікі завод па апале вапнявага каменю. Вапна здабываецца ў штольнях, недалёка ад заводу.

Завод будзе выпускаць звыш 20.000 тон каменю. Гэта вытворчасьць мае вялікае значэньне ў справе скарыстаньня мясцовых будаўнічых матар'ялаў для замены дэфіцытных.

Каштоўная выхаходка інстытуту прамысловасьці

Скарыстаньне адкідаў галянтарэйнай вытворчасьці

Адыходы мясной прамысловасьці—рогі і капыты — даволі шырока скарыстоўваюцца па галянтарэйнай прамысловасьці. Аднак, ужываньне гэтага віду сырцу для вырабу гузікаў дагэтуль давала каля 80 проц. адкідаў.

Навукова дасьледчы інстытут прамысловасьці БССР на працягу доўгага часу вынуждаў пытаньне аб максымальным зьмяншэньні адкідаў і папыроньні сырцовай базы галянтарэйнай прамысловасьці. Пасьля 8 месяцаў упартай работы, навуковы работнік інстытуту тав. **Логіш** дабіўся атрыманьня з адкідаў рог і капытоў прадукцыі добрай якасьці. Шляхам мэханічнай апрацоўкі масы і штампоўкі атрыманы высокаякасныя гузікі.

Выпрацаньне гэтай задачы адкрывае вялікія пэрспэктывы перад галянтарэйнай прамысловасьцю: сырэц скарыстоўваецца на ўсе 100 проц. замест 20, спрашчаецца працэс вытворчасьці, значна паганяецца сабекошт тоны сырцу.

БУДАЎНІЦТВА МЭХАНІЗАВАНАЙ ГУТЫ

ГОМЕЛЬ.

Скончана ў асноўным будаўніцтва першай чаргі вялікай мэханізаванай гуты. Гута будуецца за 18 клм. ад Гомелю ля станцыі Касьцюкоўка. Блізкасьць пяскоў (4-5 клм. ад заводу) дасьць магчымасьць выпускаць высокаякасную шкляную прадукцыю. Гута, паводле папярэдніх памячэньняў, будзе давать штодзенна да 6-ці вагонаў ваконнага шкла.

Камсамольская брыгада сталяроў імя XVII МЮД'у (пасажырскі цэх заводу «Полымя рэвалюцыі» пераведзена на гаспадарчы разрахунак. Брыгада рыхтуе вагонныя варштаты для заводу «Ударнік».

А. Манькоў

Воля калектыву

Сакратар бюро партколектыву заводу «Бальшавік» тав. Гелер разгарнуў пашку, дастаў пенялікі кавалак паперы і абвясьціў парадак дня пасяджэньня бюро:

— Мы сёньня разгледзім дванаццаць пытаньняў. Яны пенялікія, мы іх хутка вырашым. Калі няма дадаткаў, хічу пасяджэньне адкрытым.

Пытаньні былі будзённыя, звычайныя, пытаньні кіраўніцтва ўсёй вытворчай работай вялікага прадпрыемства, кіраўніцтва барацьбой калектыву за перамогу. Па кожным пытаньні выступалі, гаварылі, спрачаліся.

Рантам адчыніліся дзьверы і ў памяшканьне ўвайшоў дырэктар заводу тав. Бандарчык. На яго твары мільгацела радасная ўсьмешка. Папрасіў слова і, уважліва назіраючы па прысутных, урачыста сказаў:

— Мы толькі што падагулілі вынікі нашай работы. Павінен вам сказаць, што гадавое заданьне завод выканаў за 11 месяцаў і 4 дні. Гэта значыць, мы скончылі сёньня прамфінплян трэцяга рашаючага на 27 дзён раней тэрміну...

Нечаргова заява тав. Бандарчыка часова адсунула ўсе іншыя пытаньні. Загаварылі ўсе разам. Пачалі ўспамінаць, як біліся за кожны фут скуры, за кожны кавалак сырцу. Называлі прозьвішчы лепшых ударнікаў.

Ніхто не сьпяшаўся скончыць пасяджэньне. Многа гаварылі аб задачах, якія стаяць упераде. Колькасныя паказьнікі выкананы, а вось якасьць працэнты... Яшчэ ня мала скаргаў прысылаюць абутковыя фабрыкі...

Успамінаілі члены бюро і тыя дні, калі партарганізацыя змагалася з апартуністычнай практыкай былога кіраўніцтва, якое давяло завод да буйных перакажэньняў. Успаміналі, як пераадолвы рабочыя-ўдарнікі з бальшавіцкай непрымірымасьцю білі па пыцках і малаверах.

Калі скончылася пасяджэньне, было ўжо дванаццаць гадзін ночы.

**
*

Завод «Бальшавік» прышоў да перамогі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі, дзякуючы рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна і шырокаму разгорнутаму ўдарнага руху. Прагульшчыкі, пральтаі, якія часамі пралазілі ў рады ўдарнікаў, перавыхоўваліся ў заводзкім катле і станавіліся прыкладнымі рабочымі. Ва ўсёй рабоце заводу адчувалася сацыялістычнае спаборніцтва, кваля якога высока ўзьнімалася сярод рабочых. Намазчык спаборнічаў з намазчыкам, стругаль са стругалём.

Група рамнічыкаў Эйсмана доўгі час адставала. Яна не выпускала больш 80 рам у дзень. А група Гельфанда давала штодзенна 100-120 рам. На брыгадным сходзе Эйсман папрасіў слова:

— Наша група таксама вяўляецца ўдарнай. Здаецца, нічога працуем. Але чамусьці адстаем...

— Ні ўмееце працаваць—вось у чым бяда, таму і адстаяце,—буркнуў рабочы з групы Гельфанда.

— А вы дапамажэце, навучэце нас, —спакойна адказаў Эйсман.

Лепшы ўдарнік Шапіра ўпёс прапанову—пасадзіць у групу Эйсмана некалькіх ударнікаў і паказаць, якімі мэтадамі можна дабіцца выкананьня праграмы. Да Эйсмана ўцаў паслалі самога Шапіра.

На другі дзень тав. Шапіра, азнаёміўшыся з работай у групе Эйсмана, заўважыў:

— Э, браткі, у вас-жа поўная абязьлічка. Час пачынаць работу, а вы інструмантаў шукаеце.

Праз два дні група Эйсмана запісвала ў свой штодзенны баланс 110 рам, яшчэ праз некалькі дзён—120 і нават 125.

Брыгада рамнічыкаў другога хромавага цэху такую-ж буксірную работу правяла на ўсіх групах. Брыгада перайшла на гаспадарчы разрахунак і ўвесь час перавыконвае свой плян. Яна дабілася эканоміі на матар'ялах за верасень і кастрычнік больш як на 6.000 руб.

У рамнічыкаў першага хромавага цэху вытворчая праграма перавыконвалася, але ў верасьні і кастрычніку, замест эканоміі, яны перавыдалі на матар'ялах 19.878 руб. Тады рамнічыкі другога хромавага цэху ўзялі на буксір таварышоў з першага хромавага. Яны перадаюць ім мэтады сваёй работы, практычна дапамагаюць наладзіць улік працы матар'ялаў...

Тав. АРОЦКЕР — майстар 1-га хромавага цэху заводу «Бальшавік» — уніёс шмат рацыяналізатарскіх прапаноў. Галоўныя прапановы далі за год 10.000 рублёў эканоміі.

**
*

Скончыла працу першая зьмена... Брыгадзір намазчыкаў першага хромавага цэху тав. Дарожкін падагуліў вынікі выкананьня дзённага заданьня. Праграма перавыканана на 10 проц., а вось матар'ялы перавыдаткаваны. З цэху вышлі ўсе разам. Доўга гутарылі на гэту тэму. Дарожкін разьвітаўся з таварышамі і накіраваўся ў другі хромавы цэх. Треба параіцца з намазчыкам Аляшкевічам.

— Ну, як працуеш?—запытаўся Аляшкевіч.

— Плян выконваем, а вось наконт эканоміі—дрэнна. Нічога не атрымліваецца. Здаецца, сочыш як треба, а эканоміі няма.

— Кепска сочыш...

— Моха і кепска. Дык вось навучы. У цябе за два месяцы звыш 500 руб. эканоміі, а ў мяне 559 руб. перавыдатку.

— Станавіся, намазвай...

Дарожкін, ні слова ня кажучы, узяўся за намазваньне скур. Аляшкевіч прымаў іх і адкідваў да сьцёнкі.

— Ну, брат, так ня мажуць. Лішняй мазі даеш, таму волас ісусеца.

Усяўся Аляшкевіч за памазок і пачаў вучыць Дарожкіна. Потым пазнаёміў з пастаноўкай працы ў брыгадзе.

**
*

Так у кожным цэху... Калі, напрыклад, у стругалёў першага хромавага цэху нешта ня ладзілася, дык стругалі другога хромавага вывучалі прычыны адставаньня і перадавалі ім свой вопыт.

Адзін раз у месяц склікаліся на заводзе зьменныя сходы кожнага цэху. Заслухоўвалі даклад гаспадарніка аб выкананьні плянавога заданьня.

— У верасьні нас абагнаў першы хромавы,—заўважыў загадчык другога хромавага Шымчак на адным з такіх сходаў.—Ён выканаў праграму на 103,6 проц.

А на агульным сходзе першага хромавага загадчык Данілоўскі гаварыў:

— У другім хромавым рабочыя лепш навучыліся працаваць. У іх якасьць на належнай вышыні, і сабекошт не падгуляў.

— Нагоним,—заявілі рабочыя першага хромавага.

— Не адстанем,—гаварылі ўдарнікі другога хромавага.

І не адставалі... Абодвы цэхі выканалі гадавое заданьне яшчэ 24 лістапада. Камуністы і камсамольцы паказвалі сапраўдныя ўзоры барацьбы за прамфінплян.

Прагульшчыкаў, п'яніц перавыхоўвалі, падтрымвалі. Асабістым прыкладам паказвалі, як трэба працаваць.

У другім хромавым была група прагульшчыкаў—Шынкевіч, Кляўсэ, Чэрамісін, Шчуцкі і іншыя. Ня раз выклікаў іх загадчык цэхай і прачытваў «бацькаўскую» нотацыю, пытаўся аб прычынах прагулу. Прагульшчыкі ня раз абяцалі:

— Памыліліся, больш ня будзем.

Усё-ж такі, ня гледзячы на абяцаньні, на работу пазьнімаўся, часта зусім ня прыходзілі. Тады бралася за іх брыгадная трыбунэлі, цэлымі тыднямі растлумачвалі, якую шкоду прыносяць прагулы. Многія прагульшчыкі сталі прыкладнымі ўдарнікамі. Тых, каго зусім нельга было перавыхаваць, проста выкідвалі з заводу.

**
*

5-га сьнежня ў цэхах пачаваў надзвычай урачысты настрой. Адбывалася мітынг. Гаварылі аб задачах па далейшае.

Выступае рабочы Запольскі ад камсамольскай брыгады стругалёў:

— Наша брыгада будзе біцца за датэрміновае выкананьне пяцігадовага году. Ад сёньняшняга дня бярэм на сябе абавязак—павялічыць норму выпрацоўкі з 104 выростак да 110. Норму апрацоўкі сьпіных скур павялічаем з 124 да 150.

— Мы павялічваем норму райкоўкі на 5 проц.—перабівае Запольскага ўдарнік Іваноў, які прадстаўляе групу райкоўшчыкаў.

Адзін за другім выступаюць ударнікі. Яны спаборнічаюць на большае павышэньне нормы, бяруць новыя самаабавязацельства па выкананьні прамфінпляну.

Усе выступленьні вяўляюцца найлепшым доказам таго, што ўвесь калектыў «Бальшавіка» пад кіраўніцтвам партыі выйдзе пераможцам і ў апошнім — чацьвертым годзе пяцігодкі.

Зьнесьці рагаткі бюракратызму на шляху вылучэньства

(Рэйд магілеўскіх ударнікаў друку)

Адным з буйнейшых заваяваньняў у галіне барацьбы з бюракратызмам зьяўляецца новая масавая форма рабочага кантролю зьнізу—шэфства заводаў над савецкім апаратам і перадача рабочым выкананьня паасобных функцый у апараце. Сацсумяшчэньне, як вышэйшая форма шэфства, зьяўляецца вялікім крокам па шляху ажыцьцяўленьня ўказаньняў Леніна аб прыцягненьні працоўных да дзяржаўнага кіраўніцтва, без адрыву ад вытворчасьці.

ЦК, ЦКК і ЦСНСБ у мэсьце да ўсіх нізавых арганізацый, ня так даўно апублікавалы, далі рад катэгарычных дырэктыў аб разгортваньні шэфскай работы і сацсумяшчэньні. У лісьце прапанавана ўсім арганізацыям змагацца з ігнараваньнем вылучэнцаў, з выпадкамі апашленьня сацсумяшчэньня нядбайных, бюракратычных адносін да рабочых сацпамесьнікаў.

Рэйд брыгад друку, нядаўна праведзены па ўстановах і прадпрыемствах гор. Магілева, паказаў, што дырэктывы партыі і вышэйшых прафарганізацый яшчэ не знайшлі належнага адбітку ў шэфскай рабоце па горадзе.

Вылучэнцы часта сустракаюць лёўна ігнаруючыя адносіны з боку работнікаў савецкага апарату і мясцовых арганізацый.

Вось прыклады. У Магілеўскім ЦРК працуюць рад рабочых-вылучэнцаў. Ячэйка і мясцком ЦРК навіны былі дапамагчы іх рабоце, скласьці належныя ўмовы працы, але ні ячэйка, ні мясцком не зацікавіліся работай вылучэнцаў, нарады ня зьбіраліся, спрыяючыя ўмовы для работы ня складзены. Работніца-вылучэнка **Сімховіч** на працягу чатырох раз аддавалася пад суд і кожны раз яе апраўдвалі. Паказаць не Сімховіч выразна сьведчыць аб недапушчальных адносінах да вылучэнцаў, якія мелі месца ў ЦРК. Многіх вылучэнцаў нагрузім дзелавоцтвам, канцыляярыцкай замест азнаямленьня з сапраўднай каапэрацыйнай работай.

Вылучэнец з Саюзхлеба тав. **Іофэ** больш паўгода жыве з сям'ёй у маленькім праходным пакоі, а арганізацыі Саюзхлеба пальцам аб палец ня стукнулі каб палепшыць яго бытавыя ўмовы.

У ашчадкасу вылучылі 4-х рабочых-ударнікаў, усіх іх назначылі на адказныя пасады. Між тым яны ніякай таварыскай дапамогі ня сустрэлі. Тэхнічная вучоба не арганізавана. Вылучэнец **Ярмонін**, назначаны загадчыкам аддзяленьня ашчадкасы, у часе хваробы быў зьнят з працы і пакінут рэзэрвовым інструктарам.

Рэйд брыгад выявіў таксама няўважлівыя адносіны нізавых заводзкіх арганізацый да сацпамесьнікаў-вылучэнцаў. Швэйная фабрыка імя Валадарскага высунула больш трыццаці чалавек у савецка-каапэрацыйны апарат, але ні партколектыў, ні фабком канкрэтнай дапамогі ім не аказваюць, вылучэньне праводзілася габінэтным парадкам, без абгаварэньня кандыдатур на рабочых сходах. Амаль ні разу ня склікаліся нарады вылучэнцаў, ніхто не запытаўся ў іх, як яны працуюць.

Хлебазавод таксама паслаў у савецкі апарат рад рабочых, апошнія некалькі раз прыходзілі на завод, прасілі заслухаць іх справаздачы, арганізаваць ім таварыскую дапамогу, але фабком і парт'ячэйка засталіся глухімі.

Вылучэнца **Аўчыньнікава** арганізацыі заводу імя Сталіна выселілі з кватэры.

Рабочы-вылучэнец т. **Чэрнін** павінен быў атрымаць на швэйнай фабрыцы два метры дроў, але фабком вынес «мудрую» пастанову: «дроў не выдаваць, бо Чэрнін не працуе на заводзе».

Прыклад цукернай фабрыкі, якая вылучыла 8 рабочых на розныя адказныя пасады, паказвае, як трэба паставіць работу па шэфстве і дапамозе вылучэнцам і сацпамесьнікам. Раз у тры месяцы паладжваюцца на фабрыцы агульныя сходы, на якіх заслухоўваюцца справаздачы вылучэнцаў. Арганізаваны курсы па падрыхтоўцы рабочых-сацпамесьнікаў, выяўляюцца далейшыя рэзэрвы для вылучэньня без адрыву ад вытворчасьці, адчуваецца чыста таварыская дапамога, якая дае магчымасьць вылучэнцам справіцца з даручанымі ім абавязкамі. На цукернай фабрыцы павінны раўніцца ўсе іншыя арганізацыі прадпрыемстваў Магілеўшчыны.

Неабходна прыцягнуць да адказнасьці адміністратараў і паасобных нізавых партыйных і прафэсыянальных работнікаў, якія ігнаруюць работу па шэфстве і сацсумяшчэньні.

Бюракратычныя рагаткі на шляху вылучэнства павінны быць зьнесены.

Брыгада друку: **Чапліна, Пэйсахаў, Каваленка, Абложны, Аўтушкава, Гаўранская, Ціцялюў, Парамонаў, Калашнікава, Шапіра, Крыловіч, Шалтыка, Купрэеў, Юрчанка, Савін, Слонімскі, Карнядубаў, Шырман, Рудэрман, Сівакоў, Мазурава, Васькоўскі, Буры.**

Як мы эканомім апал?

ДЗЯРЖПЛЯН БССР, ЦСНСВ і «ЗЬВЯЗДА» СКЛІКАЮЦЬ 12 СЬНЕЖНЯ, У 7 ГАДЗ. ВЕЧАРА, У ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ДЗЯРЖПЛЯНУ (ПЛЯЦ ВОЛІ) НАРАДУ ПА ПЫТАНЬНІ АБ ЭКАНОМІІ АПАЛУ. БУДУЦЬ ЗАСЛУХАНЫ: ДАКЛАД ТАВ. ЧУДНОЎСКАГА АБ НАШЫХ АПАЛАВЫХ РЭСУРСАХ, ПРАГРАМЕ 1932 ГОДУ І ТРОХМЕСЯЧНІКУ ЭКАНОМІІ АПАЛУ, ІНФАРМАЦЫІ — ШТАБУ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ТРОХМЕСЯЧНІКА ЭКАНОМІІ АПАЛУ (ТАВ. ЛУШЫЦ), БЕЛТОРФУ — АБ ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ, МЭХАНІКА ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК» ТАВ. БУРАВА, АБ ВОПЫЦЕ ЗАВОДУ Ў ОПРАВЕ ЭКАНОМІІ АПАЛУ.

НА НАРАДУ ЗАПРАШАЮЦЦА ПРАДСТАЎНІКІ ЦКК-РСІ, ГАРКК, ВОНГ, Б ЛЭНЭРГА, ІНСТЫТУТУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, БЕЛМБІТ, ГАРМБІТ, ЭНЭРГАКАМІТЭТУ, ПП САЮЗАЎ РАБОЧЫХ МУКАМОЛЬНА-ХЛЕБНАЙ, ГАРБАРНА-АБУТКОВАЙ, КЕРАМІЧНАЙ, ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ЛЕСДРЭЎ НАРХАРЧ, КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ, СЕЛЬПРАМ, А ТАКСАМА РАБОТНІКІ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ВЕДАЮЦЬ АПАЛАМ, І КАЧАГАРЫ.

Спыніць сьвістапляску цэн

Устанавіць цьвёрдыя нормы гандлёвых накідак

«Дагэтуль ня толькі ня выгная нэпманскі дух і ня выдалены бюракратычныя элемэнты з гандлёва-каапэрацыйнага апарату, але за апошні час цыйнага апарату, але за апошні час з новай сілай выявіліся праяўленьні нэпманскага духу, якія выражаюцца ў адсутнасьці сапраўдных клопатаў аб адсутнасьці сапраўдных клопатаў аб спажыўцы, у грубым парушэньні паслітыкі цэн, у захапленьні камэрцыйным гандлем, ва ўздуваньні цэн, у пагоні за высокімі прыбыткамі». (З пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б).

Устанаўленьне цэн — гэта якраз гатой пункт дзейнасьці гандлёвых арганізацый, у якім больш, чым дзе, крыецца небясьпека грубага парушэньня агульна-палітычнай лініі партыі. Усялякае скажэньне савецкай палітыкі цэн знаходзіцца ў супярэчнасьці з задачай няўхільнага павышэньня матар'яльна-культурнага ўзроўню рабочых і працоўных мас.

У практыцы гандлюючых арганізацый БССР, дапушчаны грубыя скажэньні гэтых прынцыпаў савецкай палітыкі цэн.

Гандлюючыя арганізацыі, за выключэньнем Белгандлю, за апошнія гады не атрымліваюць ад НКСнабу БССР і Белкаапсаюзу ніякіх норм гандлёвых накідак на адпускныя цэны прамысловасьці. Праўда, ёсьць зборнік пастаноў Наркамгандлю за 1927-29 г. г. Але гэты зборнік надзвычай пастарэў, з ім ніхто, пачынаючы ад Наркамснабу і канчаючы каапгандлюючымі арганізацыямі, ня лічыцца.

Белкаапсаюз у верасьні г. г. распрацаваў, а Наркамснаб БССР зацьвердзіў цьвёрдыя нормы гандлёвых накідак для спажыўкаапэрацыі, але гэтыя нормы да апошняга часу ня былі ўведзены.

Такім чынам, гандлюючыя арганізацыі БССР у такой важнай палітычнай справе, як устанаўленьне раздробных цэн, працуюць без усякага канкрэтнага кіраўніцтва Наркамснабу БССР і Белкаапсаюзу. Зразумела, што гэтым самым паказаныя кіруючыя арганізацыі аб'ектыўна санкцыянавалі праяўленьні ў справе нацэнак «уласнай ініцыятывы».

На практыцы гэта прыводзіць да таго, што цэны вызначае (зусім самастойна) калькулятар гандлюючай арганізацыі, які кіруецца толькі ўласнымі, «камерцыйнымі» меркаваньнямі. У менскім ЦРК гандлёвыя накідкі на рэчы касавага спажываньня вызначае калькулятар, які ня мае ніякіх норм не ўзгадняе сваіх накідак з кіраўніцтвам МЦРК. Ён карыстаецца ўласным праектам норм гандлёвых накідак, які (праект) нідзе нават не абмяркоўваўся. Аналёгічнае становішча ў гомельскім ЦРК, гомельскім ТСТ і ў інш. спажыўтаварыствах.

Атрымліваецца так, што калькулятары робяць як хто можа і разумее. У выніку такога сваволля ў налёўнасьці недапушчальна высокія гандлёвыя накідкі на тавары нырокага спажываньня. Так, па менскім ЦРК гандлёвыя накідкі па гатовае адзеньне складаюць па многіх рахунках 21-27 проц. да адпускной цаны прамысловасьці, плюс падатак і ўсе нацэнкі, на абутак — 16 проц., на трыкатаж — 18-27 проц., на галянтарэю — 27-48 проц., на танныя кандытэрскія вырабы (цукеркі і пернікі) — 18-29 проц., на безалькагольныя напіткі — 41 проц., на каву і суррагаты — 25 проц.

У адносінах да чыстай (бяз усякіх надбавак) адпускной цаны прамысловасьці гандлёвыя накідкі МЦРК складаюць яшчэ большыя процанты. Прычым такія нацэнкі робяцца ў адносінах найбольш ходкіх тавараў. Напрыклад, на абутак цаной на звыш 10 руб., накладалася 16 проц., на дзіцячыя капцулі цаной па 72 кап. накладалася 23-27 проц., на дзіцячую вопратку цаной у 2 руб. — 22 проц., на звычайныя шапкі па 1 р.20 к. накладалася 22-25 проц., на тканыя жаночыя панчохі — 22 проц., на мінэральныя воды і квасы ў разгары лета—41 проц. і г. д.

Адсутнасьць цьвёрдых норм гандлёвых накідак прыводзіць да поўнага разнабою ў цэнах паміж асобнымі гандлюючымі арганізацыямі. Для ілюстрацыі прыводзім некаторыя лічбы.

Наркамспабам вызначаны 12 проц. гандлёвых накідак па гатовае адзеньне. Між тым, на гэты тавар МЦРК робіць накідку ў 19 проц., гомельскі ЦРК — 12 проц., гомельскае ТСТ — 14,3 проц., церахаўскі райсаюз — 2,9 проц., Белгандаль — 16 проц. і г. д. Па абутку вызначана 9 проц., МЦРК робіць накідку ў 16 проц., гомельскі ЦРК — 12 проц. і г. д. І так амаль па ўсёй групе найбольш ходкіх тавараў.

Характэрна, што на рэчы раскошы гандлёвыя накідкі часамі меншыя, чым на рэчы масавага спажываньня. Менскі ЦРК, напрыклад, робіць гандлёвыя накідкі на жаночыя шаўковыя польты — 20 проц., а на дзіцячую тканую вопратку — 22 проц., гомельскі ТСТ на гаспадарчае мыла робіць накідку ў 19 проц., а на парфуму—11 проц.

Стварэньню гэтай хахарды і блытаніны ў справе вызначэньня гандлёвых накідак і раздробных цэн спрыяе так званая цэльная сыстэма складаных накідак і скідак, якія награмаджаюцца адна на другую і робяць справу калькуляцыі «кітайскай граматай» для малакваліфікаваных работнікаў вясковай спажыўкаапэрацыі. Ня дзіва, што ў некаторых выпадках (церахаўскі райсаюз) калькулятары вызначаюць гандлёвую накідку ў процантах не да асноўнай цаны трэсту, а да тай цаны, на якую ўжо зроблены падатковыя і іншыя нацэнкі. А гэта ў сваю чаргу прыводзіць да павышэньня абсалютных разьмераў гандлёвых накідак.

У другіх выпадках калькулятары, заблытаўшыся ў нацэнках, устанаўліваюць продажную цану ніжэй сабекошту, і гандлёвыя арганізацыі (гомельскі ЦРК, гомельскі райсаюз) церпяць страты.

Не атрымліваючы ніякіх норм, аб'яднаньні Белкаапсаюзу вызначаюць надзвычайна высокія процанты камісіі за тавары, якія праходзяць праз іх рукі ў гандлёвую сетку. Па радзе тавараў камісія аб'яднаньняў даходзіць да 6 проц. і ніколі ня ніжэй 2-2,5 проц. сумы рахунку.

Усе гэтыя факты з асаблівай сілай падкрэсьліваюць паяўнасьць **недапушчальнай блытаніны і грубых скажэньняў** савецкай палітыкі цэн. Гэтыя скажэньні жывяцца **«нэпманскім духам»**, які яшчэ далёка ня вытручан з цэлага раду зьвеньняў каапэрацыйна-гандлёвага апарату. Праяўленьню гэтых чужых савецкаму гандлю тэндэнцый аб'ектыўна спрыяла **нічым неапраўданае маўчаньне Наркамснабу.**

Пара спыніць сьвістапляску і разнабой у цэнах.

Гэта патрабаваньне ва ўвесь упор трэба паставіць перад раённымі партыйнымі, прафсаюзнымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі і, **ў першую чаргу перад Наркамснабам БССР.**

М. К.

Ю. Ленскі

Ад „пацыфікацыі“ да ваенна-палявых судоў

Прайшоў год ад таго часу, калі ўрад Пілсудзкага ўжыў крывавую «пацыфікацыю» на Заходняй Украіне, адкуль пацыфікацыйныя мэтады фашысцкага тэрору былі перакінуты ў Заходнюю Беларусь і Польшчу. Сыстэма карных экспедыцый была ўжыта ня толькі на вёсцы, але і ў горадзе. Фашысцкі ўрад «пацыфікаваў» з кожным разам усё новыя тэрыторыі, ахопленыя рэвалюцыйным хваляваньнем. Тагочасны міністар унутраных спраў Трэцяк-Скалескі хваліўся ўжо, што «па Заходняй Украіне пануе спакой».

Але «пацыфікацыя» ня стрымала напору рэвалюцыйнай хвалі. Рэвалюцыйны рух ахапляў штораз шырэйшыя колы, набываў штораз вастрэйшыя формы. «Пацыфікацыя» ня толькі не змагла стрымаць насьпяваньня рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы, але ўзбудзіла яшчэ большую нянавісьць у працоўных масах, яшчэ больш наблізіла масы да непасрэднай барацьбы з фашысцкай дыктатурай.

Год ад пачатку ад «пацыфікацыі» быў **ГОДАМ ПЕРАЛОМУ**, годам узмоцненай барацьбы працоўных мас з фашызмам. Бурныя выступленьні беспрацоўных 25-га лютага, штурмаваньне магістратаў і гмінных управаў, заладзілы бойні ў Дамброўскім басэйне, Маневічах і Любартове 1-га мая, геройская жаністоўка гарняжоў і барыкадная барацьба ў Явожне, пістарычная забастоўка варшаўскіх трамвайшчыкаў, стачкавыя выступленьні сялян, супроць начатковага грабежніцтва, праяўленьні глухога хваляваньня ў арміі — вось рэвалюцыйныя плёны мінулага году. Штораз часьцей рабочыя і сяляне пераходзяць да крывавых сутычак з паліцыяй. «Стрэльцы», КОП'ам і г. д.

Робяць штораз мацнейшым імкненьне мас да зброі.

Банкрутства пацыфікацыйных мэтадаў у барацьбе з рэвалюцыйным рухам яна выявілася на Заходняй Украіне, дзе новая хваля нацыянальна-вызвалеўчага руху ўдарыла з нізвычайнай сілай па асновах польскай акупацыі. Упартыя забастоўкі, бурныя дэманстрацыі беспрацоўных, баявыя выступленьні сялянскіх мас супроць шарваркаў і падатковых экзэкуцый, стыхійныя падпаленьні памешчыцкіх маёнткаў сталіся са зорайшымі на падамі на паліцэйскія пастаўкі, з розными формамі арганізацыі дзяржаўнага апарату. На гэтым фоне замах на Галушку, як выяўленьне нянавісьці украінскіх працоўных мас да польскай акупацыі, быў выступленьнем супроць акупацыйнай сыстэмы польскага імпэрыялізму і ўдарыў па распэўсюджанай фашысцкім урадам казцы аб заспакаеньні «трэсаў». Дзейнасьць Галушы была тыповым утачненым увасабленьнем акупацыйнай сыстэмы, якая, як падкрэсьлівае адозва ЦК КПП, «можа быць вывернута толькі праз масавую рэвалюцыйную барацьбу рабочых і сялян Заходняй Украіны і Беларусі ў саюзе з пралетарыятам і сялянствам Польшчы, толькі праз збройнае паўстаньне рабочых, сялян і салдат ва ўсёй дзяржаве». Дзейнасьць Галушы яўляла сабой праграму польскага імпэрыялізму, заснаваную на падрыхтоўцы да новай захватніцкай вайны супроць Савецкага Саюзу. Сустаўная частка гэтай падрыхтоўкі — згода польскай буржуазіі з шырокімі коламі украінскай буржуазіі, згода, мэта якой — сцэмэнтаваць маналітны буржуазны фронт у барацьбе супроць небясьпекі пралетарскай рэвалюцыі.

Таму з такім шаленствам завыла польская буржуазія, даведаўшыся аб сьмерці Галушы. Таму ўсе буржуазныя партыі ад ББ, праз НД на ППС уключна, салідарна выступілі над магілай Галушы, як выяўніка імкненьняў імпэрыялістычнай Польшчы.

«Тадэўш Галушка — паводле акрэсьленьня «Польскага слова» — быў пластуном праграмы польскай усходняй палітыкі, які бачыў у ёй гарантыю і необходную ўмову магутнай будучыні дзяржавы, які адначасова глыбока верыў, што рэалізацыя гэтай палітыкі — гэта найважнейшая этычная місія незалежнай Польшчы, гэта адна з найглыбейшых маральных рацый яе існаваньня».

«Посьвіт гэтай веры, апостал гэтай гістарычнай місіі ўзроджанай Польшчы на ўсходзе—Тадэўш Галушка быў шчырым і актыўным прыхільнікам незалежнасьці заборучанскай Украіны. Цьвёрда і непахісна стоячы на пазыцыі інтэгральнай прыналежнасьці Усходняй Малой Польшчы да Польскай Дзяржавы, ён прапаведваў ідэю згоды і польска-украінскага супрацоўніцтва ў паўднёва-ўсходніх ваяводзтвах, лічачы яе за адну з умоў, якая дапаможа рэалізаваць нацыянальныя украінскія ідэалы над Дняпром».

Такім чынам праграма, якую праводзіў Галушка — гэта, з аднаго боку, умацаваньне існуючай польскай акупацыі, а з другога — пашырэньне межаў гэтай акупацыі на Ўсход пад прыкрыцьцём «незалежнай заборучанскай Украіны». У імя гэтай праграмы Галушка праводзіў «польска-украінскую» згоду ў «паўднёва-ўсходніх ваяводзтвах».

«Ідэя Галушкі, паводле думкі «Польскага слова», будзе выканана, праграма Галушкі будзе рэалізавана».

З сапраўднай сымпатыяй пісаў аб Галушку «**Роботнік**», усхваляючы вуснамі Тугута «чыстыя інтэнцыі», «надзвычайную дабрату» і «шчыры патрыятызм» гэтага сатрапа-пацыфікатара, якога, як і шмат іншых, выхавала пэпэсэўская школа.

«Ён папэўна не належаў да сярэдніх спажыўцоў хлеба, ня быў ні нацыяналістам па дактрыне, ні ворагам украінскага народу» — цьвердзіў са сьлязьмі на вачох Недзялькоўскі.

«Але, аднак, знайшоўся трыбунал — чытаем у артыкуле пад назвай «Трагедыя Галушкі, — які пацісаў прыгавор сьмерці чалавеку невіннаму, чалавеку добрай волі, каб гэты чалавек не кіраваў яго народам. Мэтай трыбуналу было такое пагыбленьне бяздоньня, каб ужо ніякая добрая воля не магла праз яе працягнуць руку».

Таксама супроць забойцаў Галушкі выступіла буржуазная украінская прэса, выказаўшы глыбокае спачуваньне польскаму фашысцкаму ўраду. Напрыклад, афіцыяльны орган УНДО — «Діло» — катэгарычна асудзіў забойства Галушкі, як «вялікага патрыёта», які «жадаў перамогі сваёй ідэі». Вінаватых у замаху паводле «Діла» трэба шукаць не ў кіраўніцтве УВА, але «ў тым лягеры, які выдаў сьмяротны прыгавор Пятлюры».

На чым грунтуецца гэта «добрая воля» Галушкі? На адкідах уступак для украінскай буржуазіі, якія ілюзыямі лахманамі павінны былі прыкрыць крывавую пацыфікацыю украінскага народу. Эндэцкая прэса пачала нават крычаць аб пагрозе аўтаноміі для «паўднёва-ўсходніх ваяводзтваў». У адказ на гэта частка санацыйнай прэсы пацьвердзіла што праграма Галушкі «была супроць усякіх аўтаномных думак».

«Мала таго — чытаем у цытаваным вышэй «Слове» — Галушка быў таксама супроць стварэньня дзе-небудзь на ўсходняй Малой Польшчы украінскага універсытэту. Ён лічыў, што цяпер даваць украінскаму насельніцтву якую-небудзь аўтаномію або універсытэт — гэта ёсьць умацаваньне і ўзьняцьце сепаратызму...»

Паводле «Газэты Польскай», Галушка за некалькі гадзін да сьмерці так ахарактарызаваў сваю праграму:

«Палітыка? — гаварыў ён па адрасе украінцаў. — Якая з імі палітыка — трэба дзіваць з іх выгнаць, даць ім дабрабыт і культуру, а мовай учынкаў прыцягнуць іх да сябе, зрабіць з іх красовых рыцараў, што за Найясьнейшую шчыра змагаліся. **Толькі заходта многа Чапліцкіх і Хмяльніцкіх».** (падкрэсьлена намі — Ю. Л.).

«Добрабыт», аб якім гаворыць Галушка — гэта ўзмоцненая калёніяльным грабяжом польскай акупацыі галіцка украінскіх працоўных мас, якія шукаюць выхаду з «крызісу шляхам абвостранай рэвалюцыйнай барацьбы. А «культура» якую гэтым масам дае польская буржуазія, — гэта пагромы украінскіх школ і культурна-асьветных пляцовак, гэта палёнізацыя, якая праводзіцца пры дапамозе акупацыйнага кулака.

Місія Галушкі мела мэтай аб'яднаньне украінскай буржуазіі ў імя супольнага фронту барацьбы з рэвалюцыйным рухам украінскіх працоўных мас і супольнага нападу на Савецкі Саюз. Украінская буржуазія павінна даць польскаму імпэрыялізму «гэтых красовых рыцараў, што за Найясьнейшую шчыра змагаліся». У гэтым напрамку ідзе бязумоўна згодніцкая палітыка украінскай буржуазіі, ня гледзячы на абвостраньне на фоне эканамічнага крызісу ўнутраных супярэчнасьцяй паміж пануючай польскай буржуазіяй і яе падпараджанай украінскай саюзьніцай. Выхаду з крызісу украінская буржуазія шукае таксама ў контр-рэвалюцыйнай вайне супроць СССР — эканамічнай польскага імпэрыялізму на Ўсход.

«Супроць сусьветнага крызісу — пісала ў палове верасьня рэдакцыя «Діла» — распачалася міжнародная акцыя, на чале якой сталі англа-саксонскія дзяржавы, але акцыя гэта ня мае вялікіх перспэктыў на ўдачу, калі адна шостая частка ўсяго сьвету апанавана бальшавікамі.

Прайшоў беспаваротна час, калі культурныя дзяржавы маглі адмежавацца ад Савецкага Саюзу. Неабходнасьць барацьбы паміж бальшавікамі і іх праціўнікамі выцякае з самой сутнасьці цяперашняга сусьветнага крызісу.

Народы, якія душацца ў коле сучаснага крызісу, павінны зьвярнуць сваю увагу на тэрыторыі, якія абяцаюць ім ратунак і выхад з гэтага крызісу.

Наш найбліжэйшы лёс залежыць у значнай меры ад таго, ці зможам мы зразумець тыя рэальныя акалічнасьці і ці прыстасуемся да іх...

Імкненьні тых нацыянальнасьцяй (якія засялюць СССР) да супрацоўніцтва з сусьветнай гаспадаркай—на руку патрэбам сусьветнага капіталу, што шукае новых тэрыторый».

Украінская буржуазія добра ўяўляе, што праграма згоды з польскім імпэрыялізмам сустракае варожыя адносіны ня толькі з боку украінскіх працоўных мас, але і шырокіх пластоў украінскага гараджога-дробнага мяшчанства. Фэрмэнт у нізах украінскіх згодніцкіх партый у апошні час ахапіў нават зьвязаныя поўвайсковай дысцыплінай нізавыя арганізацыі УВА. Атэзтуль іменна выцякаў скапітыцызм Галушкі да ўласнай праграмы.

«Украінская моладзь — пісаў ён за два тыдні перад сьмерцю — з кожным разам усё больш адыходзіць ад стройшага украінскага грамадзтва, ідучы дарогай кансьпіраціі і тэрору. Што з таго, што «Діло» адмаўляецца ад тых злачынных актаў, урачыста заяўляючы, што вінаватыя супольнага з імі украінскае грамадзтва ня мае, цьвердзячы, што гэта ўчынкі не адказных адзінак, тады, калі ўсе бачаць, што гэтыя адзінкі вярбуюцца з радоў дзейнай украінскай моладзі, якая з кожным разам усё больш выразна продстаўляецца сваім бацькам. І што-ж дзіўнага ў тым, што украінская моладзь пройціставіцца, не паважае Лявіцкага, Луцкага, Мудрага і іншых правадыроў УНДО, бо калі, з аднаго боку, яны асуджаюць дзейнасьць найбольш гарачых і рашучых сярод моладзі, дык адначасова, з другога боку, ня могуць яны да

Мабілізацыяй усіх сіл даб'емся выкананьня фінпляну

Адзін за другім лепшыя ўдарнікі фінансавага фронту рапартавалі зьлёту аб сваіх дасягненьнях, аб новых кітагах барацьбы за фінплян.

Дэлегаты Сіроцінскага, Жыткавіцкага, Заслаўскага раёнаў, якія занялі першае месца ў БССР па мабілізацыі сродкаў, прадстаўнікі перадавых фабрык Гомелю, Віцебску, Менску падкрэсьлівалі адпадушна: «посьпехаў у барацьбе за фінплян мы дасягнулі толькі дзякуючы правільнаму партыйраўніцтву; разгорнутай масавай рабоце, выразнай расстаноўцы сіл і мабілізацыі актыву».

Прадстаўнік Сіроцінскага раёну тав. **Рыжаноўскі** паведаміў, што за час фінстафеты ў раёне было праведзена звыш 500 сходаў калгасьнікаў і аднаасобнікаў па пытаньні мабілізацыі сродкаў.

Мэтады грамадзкага буксіру слабе поўнасьцю апраўдалі. За адну дэкаду буксірная брыгада Сіроцінскага раёну зрабілася ў Бешанковічах узьнімацца крывой выкананьня фінпляну на 36 проц. Але ня ўсе раёны зразумелі вялізарнае значэньне буксірных брыгад. Арганізацыі Расонскага раёну, куды выяжджала буксірная брыгада сіроцінцаў, не дапамагалі ёй у рабоце. Брыгада Заслаўскага раёну, пасланая на Койдалаўшчыну, таксама ня сустрэла падтрыманьня.

Прадстаўнік Віцебскага гарфа тав. Кац у сваёй рапарце адзначыў, што рэалізацыя пазыкі па 117 проц. дасягнута дзякуючы дапамозе лепшых фінударнікаў фабрык і заводаў Віцебску. Так, фабрыка «Прафінтэрн» вылучыла 16 брыгад, якія штодзённа праводзілі мітынгі і даклады на адстаючых прадпрыемствах і дабіліся пералому.

Значную дапамогу ў барацьбе за фінплян аказалі таксама раённы друк і заводзкія шматтыражкі. Фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» сыстэматычна ня выконвала свайго фінпляну. На фабрыку была накіравана выязная рэдакцыя, якая сваёй арганізацыйна-масавай работай, штодзённым асьвятленьнем моду кампаніі, паказам лепшых мэтадаў барацьбы паасобных цэхаў дабілася поўнага выкананьня фінпляну 3 лютага.

Перажыткі раён на працягу першага і другога кварталу быў на апошнім месцы. У трэцім квартале ў раёне была разгорнута масавая работа, у выніку якой плян трэцяга кварталу быў выкананы на 95,5 проц. У 4-м квартале раён вышаў у першыя рады барацьбітоў за фінплян.

Узор дрэннай работы паказвае **Бяжальскі раён.**

— Мне нават нядрыемна з гэтай трыбуны рапартаваць, — заявіў прадстаўнік раёну т. **Забела.** — Квартальнае заданьне выканана на 1 сьнежня толькі на 47,6 проц. Раён зайнае адно з апошніх месц у БССР. Наша адставаньне тлумачыцца выключна дрэннай пастаноўкай работы. Большасьць арганізацый раёну ў фінэстафэту ня ўключылася. Мабілізацыя сродкаў праводзіцца па-кампанейску, бяз пляну. «Чарговасьць кампаній» ня зьнішчана. Ашчадныя касы ў раёне не разгарнулі работы, у выніку плян за тры кварталы па ашчадкасах выканан толькі на 5 проц.

Прадстаўнік беларускага аддзяленьня Трактарацэнтру тав. Каршакевіч адзначыў, што ў большасьці раёнаў рэалізацыя акцый Трактарацэнтру праходзіць недапушчальна марудна. Плян рэалізацыі акцый у трэцім квартале быў выкананы усяго на 30 проц., у 4-м — на 34 проц. Такія тэмпы ставяць пад пагрозу ажыцьцяўленьне будаўніцтва 22 новых МТС у БССР.

З прамовай, прысьвечанай ходу рэалізацыі пазыкі і становішчу ашчадсправы ў БССР, выступіла тав. **Захарава.**

Плян рэалізацыі пазыкі сярод рабочых выкананы на 116 проц., сярод калгасьнікаў — на 97 проц. і сярод аднаасобнікаў — на 38 проц. Да гэтага часу яшчэ не ліквідаваны разрыў паміж рэалізацыяй і афармленьнем падпіскі. Повыя кадры рабочых, а таксама сэзоньнікі вельмі слаба ахоплены пазыкай.

Ашчадкасы яшчэ не навучыліся працаваць па-новаму. Ня зьнішчана цягаціна, бюракратызм, чаргі ля кас. Ёсьць выпадкі, калі рабочыя ня могуць нават атрымаць даведку, ці выйграў іх нумар аблігацыі. Усе гэтыя недахопы ў рабоце ашчадкас павінны быць тэрмінова ліквідаваны.

Неабходна разгарнуць ашчадкасы на сэзонных работах, на леса і торфараспрацоўках, на загатоўках і г. д. Наблізіць ашчадкасу да калгасаў і вёсак.

***

6-га сьнежня на зьлёце ўдарнікаў з вялікай прамовай аб задачах фінработы выступіў старшыня СНК БССР т. Галадзед.

Зьлёт выбраў т. Галадзеда ганаровым ударнікам фінансавага фронту і паднёс яму жэтон.

Арганізован усебеларускі штаб па дапамозе лесазагатоўкам

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР пры ОНК арганізован усебеларускі штаб па дапамозе загатоўкам і вывазцы дроў, торфу і лесаматар'ялаў. У штаб уваходзяць: старшыня — тав. **Баскін** (НКП), члены — тав. **Парунові** (ЦК КП(б)Б), **Камзнштэйн** (ЦСПСБ), **Бутомаў** («Зьвязда»), **Сірзле** (Белкалгасцэнтр), **Сапега** (ЦК ЛКОМБ). Да ўдзелу ў рабоце штабу прыцягваюцца рэдакцыі цэнтральных газэт, Лесбел, Белторф, Белкалгасаюз, НКАЗ, НКА, ЦП саюзу лесарэўрабочых і тарфянікаў, заводы імя Варашылава, «Бальшавік» і фабрыка «Кастрычнік».

На мясцох стварацца раённыя штабы пад старшынствам члена прэзыдыуму райвыканкому.

Першае пасяджэньне ўсебеларускага штабу адбудзецца 13 сьнежня, у 11 гадзін дня, у залі пасяджэньняў СНК.

НЕАДКЛАДНА ПРЫВЕСЬЦІ Ў БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ СЬНЕГААБАРОНУ

АДМІНІСТРАЦЫЯ ВІЦЕБСКАГА, АРШАНСКАГА І ГОМЕЛЬСКАГА ЭКСПЛЁАТАЦЫЙНЫХ РАЁНАЎ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛА ПАДРЫХТОЎКІ ДА БАРАЦЬБЫ СА СЬНЕГАВЫМІ ЗАНОСАМІ

Дырэктыва тав. Андрэева ня выканана

Першыя сьнягі і марозы з выразнасьцю паказалі, што чыгуначныя арганізацыі БССР не правялі сапраўднай падрыхтоўкі да барацьбы з сьнегавымі заносамі.

У загадзе т. **Андрэева** аб асеньнязімовых перавозках катэгарычна было падкрэслена, каб **«не пазьней 1-га сьнежня г. г. скончыць усе работы па падрыхтоўцы дарог да сьнегабарацьбы».** Да гэтага патрэбна было **«безадкладна прывесьці ў спраўнае становішча ўсю сьнегаабарону** (шчыты, агарожы і інш.) **і поўнасьцю забясьпечыць камплекты неабходных сродкаў** (лапаты, кіркі і інш.)».

Аднак, трэба адзначыць, што гэты пункт загаду на чыгунках БССР у большасьці застаўся невыкананым.

Асабліва дрэнна стаіць справа з забясьпячэньнем на пэрыяд сьнегавых заносаў рабочай і гужавой сілай чыгунак.

Эксплёатацыйныя раёны не зьвярнулі належнай увагі на свалачасовае заключэньне дагавароў з калгасамі аб забясьпячэньні патрэбнай рабгужсілай.

НКП БССР павінен быў прымацаваць да чыгуначнага транспарту адведныя раёны для вярбоўкі рабгужсілы. Але, з прычыны таго, што кіраўнікі чыгуначнага транспарту не далі свачасова заяўкі, НКП БССР поўнасьцю ня вызначыў раёнаў вярбоўкі і апошняя праводзіцца бясплянава, у паражу самацёку.

Па **Аршанскім** эксплёатацыйным раёне на сёпешні дзень плян заключэньня ўмоў на неабходную колькасьць рабгужсілы выкананы толькі на 10,5 проц. і па **Віцебскім** раёне — на 36 проц. Толькі **Гомельскі** раён з заключэньнем умоў справіўся больш менш здавальняюча. Па гэтым рабоце ўмовы заключаны на 90 проц. патрэбнай колькасьці рабгужсілы.

У чым хаваюцца прычыны ганебных тэмпаў падрыхтоўкі? У тым, што нятаньне гэта педагагнывалася партыйнымі, прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі транспарту. Па **Віцебскім, Аршанскім і Гомельскім** эксплёатацыйных раёнах пляны падрыхтоўкі да сьнегабарацьбы ў масе сваёй яшчэ не прапрацаваны.

На 25, 27 і 28 дыстанцыях **Гомельскага** раёну і 12 дыстанцыі **Аршанскага** раёну да гэтага часу нават адсутнічаюць канкрэтныя пляны ачысткі станцыйных шляхоў. Графік руху сьнегавых цягнікоў таксама не распрацаваны.

Такое становішча з падрыхтоўкай да сьнегабарацьбы **пагражае зрывам кармальнага руху цягнікоў па раскладзе і выкананьню плянаў зімовых перавозак.**

Чыгуначныя арганізацыі павінны зараз-жа дабіцца крутога пералому на гэтым вучастку.

У бліжэйшыя дні ва што-б там ні стала павінна быць арганізавана плянавая вярбоўка рабочай сілы.

Канкрэтныя пляны сьнегабарацьбы павінны быць зараз-жа спушчаны ў дыстанцыі і аколодкі.

На чале абавязковага і безадкладнага выкананьня загаду т. Андрэева ў пункце падрыхтоўкі да сьнегабарацьбы павінны стаць партыйныя, прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі чыгуначнага транспарту.

Трывожныя факты

Транспартная група НК РСІ правяла абсьледваньне падрыхтоўкі чыгунак БССР да барацьбы са сьнегавымі заносамі. **Матар'ялы абсьледваньня паказваюць, што на мясцох надзвычай позна разгарнулася гэта падрыхтоўка.**

Гомельскі і Жлобінскі эксплёатацыйныя раёны падалі весткі аб колькасьці патрэбнай рабочай сілы ў НКП БССР з вялікім спазьненьнем. У выніку да раённаў яшчэ не прымацаваны пункты для вярбоўкі рабсілы. Зараз разгарнулі вярбоўку рабочай сілы мясцовыя гаспадарчыя арганізацыі, але праводзяць яе бясплянава. Ня гледзячы на тое, што пры акалодках вылучаны спэцыяльныя работнікі для вярбоўкі рабочай сілы, работа гэта праводзіцца дарожнымі майстрамі шляхам перапіскі.

У Аршанскім раёне дарожны майстар **Арлоў** даслаў, напрыклад, у калгас «Спартак» наступную адносіну: «Паводле цыркуляру МБВ чыгункі падніпяце наступны дагавор аб дачы рабсілы: **пешай — 50 чалавек, конскай — 15,** на выпадак сьнегавых заносаў і праходу веснавых вод 1931-32 году ў межах ад 18 да 24 клм.».

Праз 14 дзён пасьля пасылкі гэтага ліста атрымаўся наступны дагавор ад калгасу: «Мы, ніжэйпадпісанае праўленьне калгасу «Спартак», прымаем на сябе абавязак выслаць рабсілу па паказаньня вамі кілёмэтры на выпадак сьнегавых заносаў і праходу веснавых вод у колькасьці: **пешых — 15 чал. і конных — 5,** гры тэй умове, калі гэтыя людзі будуць вызваленыя ад іншай работы».

Як відаць, такая сыстэма вярбоўкі прыводзіць фактычна да зрыву плянаў забясьпячэньня рабочай сілай і не дае гарантыі на атрыманьне нават і тэй колькасьці рабсілы, якую вызначаюць самі праўленьні калгасаў.

Абсьледваньне выявіла, што раёны ня поўнасьцю забясьпечаны неабходнымі інструмантамі і матар'яламі. Аршанскаму раёну патрэбна драўляных лапат 42.655 штук, а ёсьць 9.109 штук; Гомельскаму раёну патрэбна 20.000, а ёсьць 18.251; Жлобінскаму — 33.108 штук, а ёсьць 16.594.

Сьнегаачышчальнікі хаця і адрамантаваны і разьмеркаваны па дыстанцыях, аднак, пробных выездаў для праверкі іх гатоўнасьці не праводзілася за выключэньнем 26-й дыстанцыі (Гомельскі раён), дзе пасьля выезду выявілася ніправільная пастаноўка падаляй істужкавых тормазаў крыльляў.

Падрыхтоўку не пачалі

ГОМЕЛЬ, 7. Шматтыражка «На сацыялістычных рэйках» правяла рэйд праверкі падрыхтаванасьці раёну да сьнегабарацьбы. Рэйд выявіў, што па радзе дыстанцый падрыхтоўка фактычна яшчэ не пачата.

Калінковіцкая дыстанцыя не забясьпечана шчытамі. Не хапае 1.000 штук. Акалодак Оноўск забясьпечаны лапатамі толькі на 50 проц.

У Калінкавічах і Оноўску не ачышчаны тупікі і шляхі ад балясту. Няма скрынь для вывазкі сьнегу. Не ўстаноўлена таксама і месца, куды звозіць сьнег.

Рабочыя шляху не атрымалі спэцвопраткі.

Кіраўніцтва раёну павінна неадклад на зьнішчыць недахопы, якія выявіў рэйд рабкораў «Па сацыялістычных рэйках».

Ударная брыгада сьлесарэў заводу «Полымя рэвалюцыі», пераведзеная на гаспадарчы разрахунак.

Сьнегаачышчальнікі яшчэ ў рамонце

ВІЦЕБСК, 6. (БЕЛТА). Да барацьбы са сьнегавымі заносамі раён не падрыхтаваўся. Сьнегаачышчальнікі знаходзяцца яшчэ ў рамонце і да вучасткаў не прымацаваны. Пробных выездаў ня было. Інструктаж брыгад не праводзіцца. Вузел не забясьпечан рабочай сілай і патрэбным інвэнтаром.

Пераважная колькасьць стрэлачных будак да зімы не падрыхтавана: дрымі не забясьпечаны, у некаторых разваліліся печы. Раёну патрэбны 25.222 шчыты, а ёсьць толькі 10.091; лапат драўляных патрэбна 12.000, а ёсьць толькі 2.000 штук; жалезных лапат патрэбна 1.668, а ёсьць 832. Чыгуначная адміністрацыя не аддала ўвагі барацьбе са сьнегавымі заносамі.

Забясьпечыць поўную вывазку торфу

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР ад 1-XII-1931 г.

1. Адзначыць, што ня гледзячы на рад партыйных і ўрадавых дырэктыў, у тым ліку і апошнюю катэгарычную пастанову ЦК КП(б)Б ад 3-XI—31 г. аб забясьпячэньні свачасовай вывазкі торфу, ніякага пералому ў гэтых адносінах няма, і мерапрыемствы, вызначаныя ў дырэктывах ня выкананы.

2. Канкрэтна пічыць устаноўленым:

а) зусім ня выканана пастанова ЦК у частцы, якая прапануе т. т. **АМБРАЖУНАСУ І АРНДТУ** склясьці на працягу 3-х дзён каляндарны плян вывазкі і разгарнуць баявымі тэмпамі работу па вывазцы (мінімум 120 тыс. тон торфу ў IУ кварт.);

б) ухіленьне т. т. **БАНДАРОВІЧА** (Белторф) і **РАДЗІЁНАВА** (Наркамправы) ад вызначанага пастановай ЦК тэрміну разьмеркаваньня гужтраспарту па раёнах і калгасах; гэта была выкананна замест першых пічбаў пістапада толькі ў апошніх пічбах;

в) скажэньне дырэктывы ЦК у частцы, якая ўскладае адказнасьць за вывазку торфу на спажыўцоў; у гэту дырэктыву загадам ВСНГ ад 5 лістапада 1931 г. № 390 унесена абязьлічка, паколькі загад перадае вывазку торфу часткова спажыўцом і адначасова ўскладае на Белторф абавязак па забясьпячэньні вывазкі гужавой і рабочай сілай, тым самым вызваляючы спажыўцоў ад сапраўднай непасрэднай адказнасьці за вывазку;

г) невыкананьне Белторфам дырэктывы адносна ўвязяньня 5-цідзённай справаздачнасьці па вывазцы торфу, прычым справаздачнасьць, наогул, у заняпадзе;

д) поўнае ігнараваньне дырэктывы адносна свачасовай падрыхтоўкі да вывазкі торфу наогул (адсутнасьць дагэтуль па пераважнай частцы торфазаводаў дагавароў з калгасамі і аднаасобнікамі аб забясьпячэньні вывазкі возчыкамі, фуражом, прамтаварамі, прыладамі і г. д.).

3. Прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ таксама адзначаюць адсутнасьць пералому ў справе канкрэтнай дапамогі ў вывазцы з боку ГК і РК КП(б)Б: мясцовыя партыйныя, камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі не мабілізаваны на вывазку торфу, амаль зусім ня прыцягнут да гэтай справы друк.

4. Выходзячы з вышэйпаказанага, прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ пастанаўляюць:

1. Паказаць т. т. Амбражунасу, Арндту, Бандаровічу і Рэдзіёнаву на невыкананьне імі адказьнейшых партыйных і ўрадавых дырэктыў аб забясьпячэньні свачасовай вывазкі торфу, папярэдзіўшы, што пры паўтарэньні такіх адносін у далейшым, вінаватыя будуць прыцягнуты да адказнасьці.

2. Прапанаваць ВСНГ Бел. пад адказнасьць тав. Амбражунаса на працягу 2-х дзён зьвяніць загад ВСНГ Бел. ад 5-XI—31 г. № 390 тайм чынам, каб зьнішчыць абязьлічку ў справе вывазкі торфу шляхам прыцягненьня спажыўцоў да непасрэднага ўдзелу ў забясьпячэньні вывазкі гужавой і рабочай сілай.

3. Улічваючы, што гужавая вывазка ў шмат якіх месцох зрываецца з-за нязьдольнасьці адносін старшынь сельсаветаў, якія ня выконваюць дырэктыў аб далажэньні больш хуткага закліканьня Дагаварэў з калгасамі і аднаасобнікамі па забясьпячэньні вывазкі возчыкамі, — прапанаваць РВК пад асабістую адказнасьць іх старшынь, забясьпечыць на працягу 10 дзён поўны ахоп дагаварамі возчыкаў, згодна разьвёрстцы Наркамправы.

4. Адначасова, улічваючы тормазы ў ходзе вывазкі з прычыны незабясьпячэньня яе прамфондамі, атрыманьне якіх па лініі Саюзторфу прадугледжана толькі ў 1 квартале 1931 г., даручыць ВСНГ і Белторфу на працягу 3-х дзён паставіць перад ВСНГ СССР пытаньне аб тэрмінавым выдзяленьні ў бягучым квартале мінімальных прамфондаў, якія ў першую чаргу разьмеркаваць паміж асноўнымі рашаючымі торфазаводамі.

3 тэй-жа мэтай заахвочваньня возчыкаў, Белторфу і Наркамправы пры ўдзеле ЦП саюзу торфасплаўцаў прамысловасьці, на працягу ня больш 5 дзён распрацаваць пытаньне аб сыстэме прагрэсыўна - прэміяльнай аплаты возчыкаў у тэй частцы зарплаты, якая падлягае выплаце прамтаварамі.

5. Прапанаваць Дзяржбанку даць тэрміновае распараджэньне райбанкам аб задавальненьні грашовымі сродкамі ў першую чаргу торфазаводаў і спажыўцоў на патрэбы вывазкі торфу, прымаючы пад увагу шматлікія фанты тормазаў у ходзе вывазкі на глебе незабясьпячэньня грашовымі сродкамі.

Адначасова прызнаць зусім ненармальным, што наперакор неаднаразовым дырэктывам, дагэтуль застаюцца неўрэгуляванымі разьлікі паміж шмат лікімі спажыўцамі і торфазаводамі, чым тармозіцца нармальная праца апошніх («Шлях да сацыялізму», Асінторф і інш.).

6. Паставіць пытаньне перад ГК і РК КП(б)Б у раёнах, дзе разьмешчаны найбольш буйныя торфазаводы (Асінторф, «Шлях да сацыялізму», Грэбнёва, «Чырвоны сьцяг», «Чырвоны Кастрычнік», «Бальшавік»), каб былі выпучаны спэцыяльныя асобы ў якасьці ўпаўнаважаных, адказных за вывазку торфу.

7. Прапанаваць цэнтральнай пракуратуры даручыць пракурорам на мясцох прыцягваць у кожным паасобным выпадку вінаватых у зрыве вывазкі да крымінальнай адказнасьці.

РАЗГАРНУЦЬ БУДАЎНІЦТВА СТАНДАРТНЫХ ДАМОЎ

Камісія выканаьня пры СНК БССР заслухала пядаўна даклады прадстаўнікоў Белсамираму тав. **Рэсіна,** Белжылсаюзу—тав. **Дзяменцева,** Менбуду —тав. **Столяра,** Белбудматар'ялу—т. **Нісневіча** і судаклад прадстаўніка НК РСІ т. **Якабсона** аб разьвіцьці жыльлёвага стандартнага будаўніцтва. Камісія выканаьня прызнала, што стандартнае жыльлёвае будаўніцтва, асабліва ў галіне вырабу і ўжываньня будаўнічых матар'ялаў, разьвіваецца зусім павольна і вызначаныя практычныя мерапрыемствы амаль не рэалізаваны.

Даржплян, у асобе тав. **Штыфмана** і ВСНГ, у асобе т. **Гальцштэйна** зусім ня вызначылі цьвёрдых заданьняў па вырабе стандартных дамоў паасобнымі арганізацыямі, не рэгулявалі, не плянавалі вырабу новых будаўнічых матар'ялаў.

Старшыня Беллеспраму тав. **Міленькі** не скарыстаў усіх магчымасьцяй для павялічэньня выпуску стандартных дамоў на бабруйскім камбінаце, патаньненьня іх сабекошту і паляпшэньня іх якасьці; Беллеспрам ня выканаў дырэктывы аб вырабе стандартных дамоў з фанэры для сэзонных рабочых.

Белбудаб'яднаньне, Белсельбуд, Менбуд не разгарнулі вопытнага будаўніцтва жылых дамоў з мясцовых будаўнічых матар'ялаў, не скарысталі вызначанага для гэтай мэты грашовага фонду і нічога не зрабілі для ўжываньня новых будаўнічых матар'ялаў.

Камісія выканаьня даручыла Беллеспраму палепшыць якасьць стандартных дамоў, якія выробляюцца бабруйскім камбінатам, і скараціць час іх зборкі. Лесбелу прапанавана не пазьней чым праз месяц рэалізаваць праект стандартнага дому, распрацаванага тэхнікам бабруйскага камбінату Клічэўскім. Камісія ўхваліла пастанову ВСНГ аб перабудове будаўнічага двара Белбудаб'яднаньня ў Гомелі ў спэцыяльнае прадпрыемства па вырабе стандартных дамоў з праграмай выпуску 180 дамоў у год.

Абвешчана вымова кіраўніку Белбудматар'ялу тав. Рабініну за зрыў праграмы па здабычы трэпелу, за несвачасовую выплату зарплаты і за незабясьпячэньне нармальных культур па-бытавых умоў рабочым, занятым на распрацоўках.

В. ВОІНАЎ

Бальшавіцкі адпор скажэньням лініі партыі

Койданаўская райпартарганізацыя, дзякуючы выязнай дапамозе раёну з боку пралетарскай дзяржавы, рашучаму паваротам бядняцка-серадняцкіх мас на сацыялістычны шлях разьвіцьця сельскай гаспадаркі, актыўнай мабілізацыі мас калгасьнікаў, з посьпехам правяла веснавую сяўбу, выканаўшы плян на 103 проц.

Праводзячы спэцыялізацыю ў жывёлагадоўча-бульбяным напрамку, маючы МТС з 46 трактарамі, раён пашырыў пасеўную плошчу з 46.648 гэкт. у 1930 г. да 60.180 гэкт. у 1931 г. Трэба асабліва адзначыць пашырэньне пасеўнай плошчы пад кармовымі і тэхнічнымі культурамі. Капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку па калгасах за год павялічыліся з 269 тысяч руб. да 456 тыс. руб. На капітальнае будаўніцтва па саўгасах з 1-га студзеня на 25-га кастрычніка патрачана ўжо 1.166 тыс. руб. і г. д.

Усё гэта стварае ўсе магчымасьці для шпарчага разьвіцьця Койданаўскага раёну ў жывёлагадоўча-бульбяным напрамку, для максымальнага павышэньня ў найкарацейшы час таварчасьці ніжняга калгасу і саўгасу.

Адна, скончыўшы з посьпехам веснавую сяўбу, раённае партыйнае кіраўніцтва замест бальшавіцкага змаганьня за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, пагналася за голымі процантамі калектывізацыі.

Побач з бязмоўным нарастаньнем руху бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы ў сувязі з посьпехамі ў часе веснавой кампаніі, у раёне мелі месца «лявацкія» загібы.

Калі мы паглядзім на тэмпы нарастаньня процантаў, на дынаміку калектывізацыі на раёне, дык убачым наступнае. На 1-га студзеня 1931 г. было калектывізавана 21,4 проц. усіх гаспадарак, на 30-га красавіка—39,6 проц., на 1-га чэрвеня—53 проц., на 15-га чэрвеня—81 проц., на 30 лістапада—96,7 проц. За другую палову чэрвеня процант узрос амаль на 30.

Той факт, што ў раёне ёсьць 40 процантаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія ўступілі ў калгас пасьля веснавой сяўбы, адначасова невыстарчальная барацьба з права-«лявацкай» практыкай, адсутнасьць канкрэтнай работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў—усё гэта прывяло да раду буйных недахопаў у часе правядзеньня асеньніх сельскагаспадарчых кампаній. Скончыўшы з перабоямі і значнымі стратамі ўборку, раён увосень дае зусім ганебныя паказальнікі. Плян сяўбы жыта выканан на 68 проц., па калгасах—па 64 проц., пшаніцы—па 38 проц., зябліва—50 проц., перавораваньня бульбы — 39 проц., апрацоўкі ільну — 14 проц. Плян збожжазагатовак на 5-га сьнежня выканан на 51 проц.

Аналізуючы гаспадарчае становішча калгасаў, трэба з усёй бальшавіцкай рашучасьцю канстатаваць, што паміж процантамі калектывізацыі і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў ёсьць вялікая дыстанцыя, якасьць работы не адпавядае колькасным паказальнікам. Гэта дыстанцыя ўвосень павялічылася яшчэ і таму, што раённае кіраўніцтва ў сваёй практычнай рабоце дапусьціла рад грубых палітычных, па сутнасьці права-«лявацкіх» памылак, якія скарыстаў кулак для дэзарганізацыі калгаснай вытворчасьці з сярэдзіны.

Здавалася-б, што пасьля апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 2-га жніўня райком павінен быў **не на словах, а на справе перабудаваць сваю работу,** сканцэнтраваць увагу ўсёй партарганізацыі на павышэньні якасных паказальнікаў, па гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Раённыя арганізацыі займаліся ўсім, толькі ня пытаньнямі гаспадарчага ўмацаваньня. Бюро РК КП(б)Б выносіла добрыя рэзалюцыі, якія заставаліся на паперы. Праверка выкананьня дырэктыў не праводзілася. Райвыканком і дырэкцыя МТС выдавалі «лявацкія» загады, некаторыя сельсаветы абкладалі цьвёрдымі заданьнямі сераднякоў.

Задача практычнага вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі, колькаснага і якаснага павялічэньня стада, стварэньня моцнай кармовай базы шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, (сіласаваньне), арганізацыі працы на МТКФ і СТКФ — яшчэ ня стала штодзённай баявой праграмай дзеяньняў партыйнай арганізацыі. Павялічэньне стада ідзе марудным тэмпамі. У параўнаньні з мінулым годам колькасьць буйной рагатай жывёлы па раёне павялічылася ўсяго толькі на 2,7 проц., сьвіней—на 23,5 проц. Аднак, выкананы колькасны плян камплектаваньня МТКФ, наглядаецца рэзкае адставаньне ў выкананьні пляну па камплектаваньні СТКФ. Трэба паставіць 3.045 сьвіначматак, а пастаўлена 1.196.

Замест сапраўднай барацьбы за жывёлагадоўлю, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне жывёлагадоўчых гаспадарак і аграмаджаньне асноўных сродкаў вытворчасьці у нова-арганізаваных калгасах—раённае кіраўніцтва арыентавала нізавыя арганізацыі на аграмаджаньне дробнай жывёлы. На нарадзе вытворчага савету 2-га вучастку з удзелам старшынь сельсаветаў і старшынь калгасаў 24 жніўня прапануецца «праўленьням калгасаў і МТС прыняць адпаведныя меры да паскарэньня ўкамплектаваньня СТКФ шляхам аграмаджаньня. Зьвярнуць увагу і на аграмаджаньне пчол».

Ідучы на сьлядох раённых работнікаў, калгас «1-га мая», Путчынскага сельсавету, пачаў аграмаджваць сьвіней і авечак, а некаторыя гора-калектывізатары пайшлі яшчэ далей. Вось характэрны прыклад:

«Выпіска з пратаколу пасяджэньня праўленьня калгасу «Усход» № 1 ад 28 верасьня 1931 г.

Слухалі: аб абагульненьні дробнай жывёлы.

Пастанавілі: На наступным агульным сходзе паставіць пытаньне аб абагульненьні дробнай жывёлы, як цялят і авечак. Праўленьне пастанаўляе абагуліць па аднэй авечцы, у каго яны ёсьць. Тых, хто будзе супраціўляцца пры абагульненьні прыцягнуць да адказнасьці і забраць жывёлу».

Зусім зразумела, што гэта «лявацкая» практыка дала магчымасьць кулацкім агентам павесьці работу за разбазарваньне і зьнішчэньне жывёлы.

Дапусьціўшы тут памылку, раённыя арганізацыі нічога не зрабілі, каб у нова-арганізаваных калгасах былі аграмаджаны асноўныя сродкі вытворчасьці — коні, сельгасінвэнтар і г. д. І тут выявілася правая практыка. Поўнае аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці, прадугледжаных статутам, зьяўляецца першай умовай барацьбы з іржэ-калгасамі.

Раённыя арганізацыі ідуць яшчэ далей. 26 жніўня прэзыдыум РВК пастанаўляе: «Прапанаваць МТС, райкалгассаюзу і сельскім саветам правесьці шырокую работу за пакіданьне ў карыстаньні кожнага калгасьніка ня больш 0,25 гэкт. гароду». Такая дырэктыва даецца ў разгар уборачнай кампаніі.

На жаль, на гэтым справа ня спыняецца. Раённае партыйнае кіраўніцтва не сканцэнтравала ўвагі на асноўных вузлавых пытаньнях гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, у першую чаргу на пытаньнях аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці, укараненьня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі, свачасовага разьмеркаваньня даходаў і выдачы авансаў калгасьнікам. Кіраўніцтва раёну робіць чарговую па мыльку. Бюро РК дае дырэктыву: «Мак сымальны разьмер калгасаў на даным этапе ўстанавіць у 3.000 гэкт. і мінімальны ў 500 гэкт.». Выконваючы пастанову бюро, дырэктар МТС Макарэвіч механічна вырашыў: «Павіны быць 52 калгасы замест 120». Жыцьцё ўнесла папраўку ў плянаваньне раённых устаноў. Засталіся ня 52, а 88 калгасаў. Але-ж механічнае ўзбуйненьне ўнесла дэзарганізацыю і толькі затармазіла пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

МТС таксама не перабудавала сваёй работы па-новаму, не паклала ў аснову сваёй работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі 6-ці ўмоў тав. Сталіна, ня стала сапраўдным арганізатарам калгаснай вытворчасьці. У 32 калгасах ня ўведзена зьдзельшчына, у 25 ня складзены папярэднія праекты разьмеркаваньня даходаў. Дырэкцыя нават ня ведае, колькі калгасаў выдала калгасьнікам авансы. Абязьлічка, адсутнасьць пастаяннай зьдзельшчыны, сацсаборніцтва і ўдарніцтва на самой МТС—вось прычыны нерацыянальнага скарыстаньня трактарнага парку. Трактары за ўвесь сэзон скарыстаны на 65 проц. Толькі за тры месяцы—май, чэрвень і ліпень—перарасходавана 80.000 кгр. гаручага і змазачнага матар'ялу.

Поўнае ігнараваньне грамадзкасьці, парт'ячэйкі, рабкому, спэцыялістаў, адсутнасьць калектыўнай прапрацоўкі пытаньняў работы МТС і калгаснага будаўніцтва, падмена масавай работы камандваньнем—характэрная рыса дырэкцыі Койданаўскай МТС. Вось пэрлы кіраўніцтва з боку дырэктара сваім апаратам:

«Вучасткоым работнікам МТС, аграномам, агратэхнікам, зоатэхнікам і рахункаводам-інструктарам.

Паўстае пытаньне, за што асобныя з вас атрымліваюць ад дзяржавы пэнсію і ці можна так працягваць беспакарана ў далейшым? Ёсьць весткі, што асобныя вучастковыя работнікі зьяўляецца толькі гастралёрамі, наглядаюцца папойкі, паводле вестак, якія паступаюць ад сельсаветаў і выяжджаючых раённых работнікаў. Відаць, што стаіць пытаньне аб тым, каб выгнаць нягодных работнікаў вон з сельсаветаў. У далейшым да тых работнікаў, якія не перабудуюць сваёй работы, будуць прыняты рашучыя меры аж да перадачы справы суду за бязьдзейнасьць. Дырэктар МТС **Макарэвіч».**

Усё гэта гаворыць за тое, што дырэкцыя ня справілася са сваімі задачамі, не змагалася за якасьць работы, за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, недаацаніла ролі МТС, як арганізатара калгаснай вытворчасьці.

***

Убачыўшы пагрозу зрыву выкананьгаспадарчых кампаній, раённыя работнікі замест наладжаньня штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва, разгортваньня шырокай масавай работы, мабілізацыі ўсёй партарганізацыі і калгасьнікаў на пасьпяховае сканчэньне гэтых кампаній — парашылі шляхам адміністрацыйных загадаў ліквідаваць галёбнае адставаньне. За подпісам старшыні РВК выдаецца наступны загад: «Сакратару сельсавету на працягу 6 гадзін давесьці плян зябліва да кожнага калгасу па днёх. Начальніку міліцыі праз свой апарат праверыць выкананьне загаду і вінаватых у невыкананьні прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці».

Яшчэ горш са збожжазагатоўкамі. Партыя кажа, што трэба арганізаваць загатоўкі, правільна расставіць сілы, скарыстаць актыўнасьць перадавых калгасьнікаў для рашучай барацьбы са спажывецкімі, месьніцкімі, рвацкімі тэндэнцыямі, якія асабліва распальвае кулак сярод адсталай часткі калгасьнікаў. А бюро райкому, забыўшы аб сваёй кіруючай **арганізуючай** ролі, ускладае ўсю работу па загатоўках на асобную пяцёрку і на гэтым супакоілася. Пяцёрка, зразумела, не дапамагла. Плян загатовак збожжа на 5 сьнежня выканан на 51 проц.

Марудносьць тэмпаў выкананьня плянаў загатовак тлумачыцца яшчэ і тым, што частка адказных раённых работнікаў заражана апартуністычнымі настроямі. Дырэктар МТС тав. **Макарэвіч** увесь час актыўна дамагаўся зьмяншэньня плянаў загатовак з 3.200 да 2.200 тон. Старшыня райвыканкому тав. **Гравіт** нават на пасяджэньні райкому абараняў апартуністычную інструкцыю, якая арыентавала калгасы ў першую чаргу забясьпечыць сябе, а потым здаваць збожжа дзяржаве (гл. «Зьвязда», 311 ад 18-га лістапада). Райком партыі ня даў належнай палітычнай ацэнкі апарт

МЭТА ЯПОНСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ— АУЛАДАЦЬ ЦЗІНЬЧЖОУ

ЖЭНЭУСКІЯ КАМЭДЫЯНТЫ ЗГАДЖАЮЦЦА З УСІМІ ПАТРАБАВАНЬНЯМІ ЯПОНІІ

Баі ў раёне Цзіньчжоу

ТОКІЕ, 7. (ТАСС). Паводле паведамленьня газэты «Асахі» з Цяньцзіну, кітайскія крыніцы сьцьвярджаюць, што 6 сьнежня ўвечары ў раёне Цзіньчжоу пачаліся баі паміж японскімі і кітайскімі войскамі.

Ліга нацый выслужваецца перад японскімі імпэрыялістамі

ПАРЫЖ, 7. Агенцтва Гавас паведамляе: «Брыян прыняў Іосізаву і вёў гутарку з ім з поваду нэйтралізацыі Цзіньчжоу. Іосізава заявіў, што японскі ўрад патрабуе, каб нэйтральная зона цягнулася ад порту Цзіньчжоу да Вялікай Кітайскай Сьцяны. Потым рада Лігі нацый абмяркоўвала пытаньне аб нэйтральнай зоне. **РАДА ЗГАДЗІЛАСЯ З ПРАЕКТАМ ЯПОНІІ** і ўсклала на рэдакцыйны камітэт даручэньне выпрацаваць тэкст контр-праекту».

„Няма сумненьня, што японская армія прыме рашучыя меры“

ТОКІЕ, 7. (ТАСС). Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнга, не падлягае сумненьню, што японская армія прыме рашучыя меры ў выпадку, калі Кітай, адмовіўшыся ад нэйтралізацыі раёну Цзіньчжоу, не адвядзе сваіх войск у межы ўнутранага Кітаю.

Акупанты настойваюць на „праве падтрымаць парадак у Манчжурыі“

ТОКІЕ, 7. (ТАСС). Міністэрства замежных спраў мае намер прапанаваць японскаму прадстаўніку ў Лізе нацый згадзіцца на прадастаўленьне Японіі права «падтрыманьня парадку ў Манчжурыі пры дапамозе экспэдыцыйнага супроць бандытаў» у форме агаворкі, якая будзе зроблена Іосізавай у спэцыяльнай заяве. Пры гэтым Кітаю не павінна быць прадастаўлена права рабіць якія-небудзь агаворкі да гэтай прапановы.

МАНЧЖУРЫЯ ЯПОНІЗАВАНА.
Японія фактычна атрымала ад Лігі нацый мандат на Манчжурыю. Банкі, прамысловасьць, чыгунка — усё знаходзіцца пад кантролем японскай ваеншчыны.
НА ЗДЫМКУ: японскія войскі на чыгуначным масьце.

„Ваенныя дзеяньні неабходны“

ТОКІЕ, 8. (ТАСС). Паводле вестак газэты «Асахі», міністэрства замежных спраў, азнаёмўшыся са становішчам у Манчжурыі, прыйшло да высноўку, што паліцыі «абязумоўна мала для падтрыманьня парадку і што неабходны ваенныя дзеяньні». Такім чынам, Японія павінна патрабаваць поўнай свабоды ваенных аперацый супроць «бандытаў», таксама і ў будучым. У той-жа час, міністэрства замежных спраў заключыла, што «кітайскім войскам не павінна быць дазволена знаходзіцца на Манчжурскай тэрыторыі. Падтрыманьне парадку павінна праводзіцца выключна японскімі войскамі». Газэта дадае, што «падобныя ўмовы зробяць магчымым для Японіі ператварыць Манчжурыю ў свабодны рынак для ўсяго сьвету».

* * *

ТОКІЕ, 8. (ТАСС). Паводле паведамленьня газэт, японскі дарадца ў Бэйпіне паведаміў Чжан Сюэ-ляна аб неабходнасьці ліквідацыі Цзіньчжоўскага ўраду па тэрыторыі Манчжурыі. Чжан Сюэ-лян ад адказу ўхіліўся. Японская місія зноў зьвярнулася да Чжан Сюэ-ляна і прыпала да заключэньня, што Чжан Сюэ-лян ня мае намеру эвакуяваць Цзіньчжоу. У рэзультаце газэта піша — міністэрства замежных спраў схільна думаць, што ў Манчжурыі трэба прыняць рашучыя ваенныя меры для ліквідацыі «бандытызму».

* * *

МУКДЭН, 8. У Мукдэне ў сучасны момант праводзяцца мерапрыемствы, якія блізка нагадваюць ваеннае становішча. Прахожыя пасьля 6-ці гадзін вечара падлягаюць вобыску, асабліва ва ўнутранай частцы гораду, прычым ваенныя ўлады тлумачаць гэта зьяўленьнем у горадзе «шпіёнаў» і актыўнасьцю «бандытаў» вакол Мукдэну.

На вуліцах Вашынгтону грыміць „Інтэрнацыянал“

ВАШЫНГТОН, 7. (ТАСС). У Вашынгтон прыехалі 1.600 удзельнікаў «галоднага паходу» беспрацоўных. Удзельнікі паходу наладзілі дэманстрацыю на вуліцах з пяньнем «Інтэрнацыяналу», нясучы плякаты, якія патрабуюць неадкладнага прадастаўленьня грашовай дапамогі на зімовы час і ўвядзеньня страхаваньня ад беспрацоўя. Пасьля дэманстрацыі беспрацоўных адбыўся прывітальны мітынг з удзелам 4.000 рабочых, на якім выступіў з прамовай прадстаўнік кампартыі тав. Фостэр. Былі мабілізаваны значныя сілы паліцыі, атрады маракоў і салдат.

Буйныя атрады паліцыі ахоўваюць рэзыдэнцыю прэзыдэнта, а таксама будынкі замежных пасольстваў і місій. Тысячы рабочых, служачых сабраліся на вуліцы да моманту прыходу беспрацоўных, якія ўвайшлі ў горад дзьвюма доўгімі калёнамі. Многія з іх прайшлі пехатою і праехалі 2.000-3.000 міль пад сьнегам і дажджом бяз цёплай вопраткі.

Цэнтральны камітэт кампартыі ПАЗШ выдаў адозву, у якой заклікае ўсіх беспрацоўных і занятых рабочых ва ўсёй краіне падтрымаваць патрабаваньні ўдзельнікаў «галоднага паходу».

* * *

ВАШЫНГТОН, 7. (ТАСС). Удзельнікі «галоднага паходу» беспрацоўных з плякатамі і сьцягамі наладзілі дэманстрацыю да будынку кангрэсу. Дэлегацыя ў складзе 12-ці чалавек, у тым ліку прадстаўнікі неграў, прабавалі ўвайсьці ў будынак з мэтай перадаць кангрэсу патрабаваньні беспрацоўных.

Паводле распараджэньня таварыша старшыні кангрэсу, моцна ўзброеная паліцэйская ахова адмовілася прапусьціць дэлегатаў у сярэдзіну будынку і прымусіла дэлегатаў адыйсьці ад уваходу. У часе дэманстрацыі, якая працягвалася звыш гадзіны, 200 паліцэйскіх, узброеных вінтоўкамі і бомбамі, якія выклікаюць сьлёзы, ахоўвалі будынак кангрэсу. Не дабіўшыся ўваходу ў будынак кангрэсу, дэманстранты настроіліся ў рады і накіраваліся да рэзыдэнцыі прэзыдэнта, дзе таксама адбылася магутная дэманстрацыя. **Гувэр адмовіўся прыняць дэлегацыю беспрацоўных.** Дэманстрацыя накіравалася потым у памяшканьне рэфармісцкай амэрыканскай федэрацыі працы. Дэманстранты выкрыквалі лёзунгі, якія выкрывалі здрадніцкую палітыку кіраўнікоў федэрацыі Грына і Уола.

Першы раз за ўсю гісторыю ПАЗШ, рабочыя, якія прадстаўляюць самыя розныя раёны краіны, белыя і негры, мужчыны, жанчыны і моладзь, дэманстравалі на вуліцах Вашынгтону з пяньнем «Інтэрнацыяналу», выкрыкваючы рэвалюцыйныя лёзунгі. Тысячы рабочых, якія сабраліся на вуліцах да моманту прахаджэньня калён беспрацоўных, у першы раз чулі і паўтаралі лёзунг: «Чорныя і белыя, аб'яднайцеся і змагайцеся». Пасьля дэманстрацыі перад памяшканьнем амэрыканскай федэрацыі працы ўдзельнікі паходу наладзілі масавы мітынг, на якім былі зноў сфармуляваны патрабаваньні беспрацоўных.

Міжнародны пралетарыят будзе напагатове

Правакацыі японскіх акупантаў на Далёкім Усходзе падбадзёрылі польскую вашчыцку. Польскіх імпэрыялістаў акрыліў дух вайны. Генэралы і палкоўнікі пачалі ваяўніча вымахваць шаблямі і зьвінець шпорамі. Маршал Пілсудзкі зараз-жа паехаў у Будапэшт складаць апошнія планы інтэрвэнцыі. Вярнуўшыся з паездкі «генэралісімусам аб'ядканай польска-румынскай арміі», маршал энэргічна ўзяўся за задушэньне рэвалюцыйнага руху, за падрыхтоўку выпаду.

Вырасьлі шыбеніцы. Увасхрэсьні горшыя часы царызму. Ваенна-палявыя суды загаварылі мовай сьмяротных прысудаў. На барацьбу з нарастаючай рэвалюцыйнай мабілізаван увесь апарат тэрору. Абнаглеўшыя фашысты не здаволіліся вешаньнем рабочых і сялян, фінцый на абзінавачаных у шпіянажы на карысьць СССР. Польскія Цьеры на шыбеніцы ваенна-палявых судоў кінулі рабочых ТОЛЬКІ за тое, што яны былі ўдзельнікамі мітынгу, праведзенага пад лёзунгам АБАРОНЫ Савецкага Саюзу. Над двума польскімі рабочымі — ЗАКШЭЎСКІМ і МАЛЕЦКІМ — вісеў СЬМЯРОТНЫ прысуд.

Але фашызм на гэты раз ПРАЛІЧЫЎСЯ. У абарону жыцьця двух польскіх пралетараў сталі рабоча-сялянскія масы Польшчы і ўсяго сьвету. Міжнародны пралетарыят грозна прадэманстраваў свой гнеўны шматмільённы пратэст. БАРАЦЬБА ЗА ЖЫЦЬЦЁ ЗАКШЭЎСКАГА І МАЛЕЦКАГА ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў АБАРОНУ СССР АД ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЗГРАІ ІНТЭРВЭНТАЎ.

Праз некалькі дзён тэлеграф па ўсім сьвеце разьнёс паведамленьні, што слуханьне справы Закшэўскага і Малецкага ў ваенна-палявым судзе СПЫНЕНА і пераведзена ў звычайны акругавы суд.

Гэтыя некалькі слоў гавораць аб выразнай ПЕРАМОЗЕ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ. Пад напорам рэвалюцыйнай гневу рабоча-сялянскіх мас фашысцкія каты ЗАДРЫЖЭЛІ. Меч, які ўзьняўся над галавой двух польскіх пралетараў, сталёвая рука пралетарыяту АДКІНУЛА прэч.

Пралетары Польшчы і ўсіх краін адбілі атаку фашызму на жыцьцё двух польскіх рабочых. Аднак, нельга забываць, што у Польшчы і надалей застаецца РЭЖЫМ ВАЕННА-ПАЛЯВЫХ СУДОЎ, ШЫБЕНІЦ І ТУРМАЎ, у Польшчы і надалей застаюцца за кратамі 10.000 лепшых сыноў рэвалюцыі.

ЭКАНАМІЧНАЯ ВАЙНА Ў ЭЎРОПЕ

Рэзкае абвастрэньне англа-францускіх супярэчнасьцяй

ЛЁНДАН, 7. (ТАСС). Англа-францускія супярэчнасьці, якія рэзка завастрыліся ў сувязі з пратэкцыяністкімі мерапрыемствамі Англіі і ўвядзеньнем Францыяй дадатковых мыт, знаходзяць яркае выражэньне ў палеміцы паміж ангельскім і францускім друкам. Рост варожых настрояў па абодвы бакі Ламанша знаходзіць таксама сваё варожае выяўленьне ў рэзкім характары заяў ангельскіх і францускіх палітычных дзеячоў. Ангельская прэса не прабуе больш захоўваць свае антыфранцускія погляды і ўскладае на Францыю галоўную адказнасьць за паглыбленьне сусьветнага крызісу.

* * *

ЛЁНДАН, 7. У палаце вобшчын міністар земляробства Гільмур унёс у другім чытаньні законапраект аб прадуктах садоўніцтва. Законапраект прадугледжвае прадастаўленьне паўнамоцтваў для абкладаньня мытным тарыфам поўных катэгорый сьвежых фруктаў, гародніны і г. д. Папраўка лейбарыстаў, якія прапаноўвалі адхіліць законапраект, была адхілена 315-ю галасамі супроць 36-ці, і законапраект быў прынят у другім чытаньні.

Новы катаржны прыгавор

ВАРШАВА, 6. У Лідзе (Заходняя Беларусь) закончыўся ў акруговым судзе працэс групы рабочых, абвінавачаных у прыналежнасьці да камуністычнай партыі. Засуджаны: Ляўковіч і Г. Троцкая — на 6 год катаргі, Левін і Каплан — на 4 гады і Л. Троцкая — на два гады.

Працэс украінскай моладзі ва Львове

ВАРШАВА, 6. Краківскі «Ілюстраваны Кур'ер цодзенны» (№ 335—ад 4 сьнежня) паведамляе аб тым, што ва Львове ў акруговым судзе распачаўся працэс украінскіх студэнтаў і гімназістаў, абвінавачаных у прыналежнасьці да Украінскай Вайсковай арганізацыі. На лаве падсудных сядзіць 6 чал. моладзі: Андрэй Даньчэўскі, Багдан Галайчук, Раман Віньніцкі, Сьцяпан Павіцкі, Мікола Мельнішын і Васіль Швэд.

За самаабарону ад пагром шчыкаў—пад ваенна-паляВы суд

ВІЛЬНЯ, 5. У часе пагрому ў Вільні выбухнула бойка паміж пагромшчыкамі і дружынамі самаабароны. У бойцы быў цяжка паранен фашыст — польскі студэнт Вацлаўскі, які пасьля памёр.

Паліцыя вяла сьледзтва і на загадзе пракурора арыштавала двух яўрэяў — рабочага Л. Залкінда і студэнта Ш. Вульфіна. Арыштаваных абвінавачваюць у тым, што яны зьяўляюцца непасрэднымі вінаватымі ў забойстве Вацлаўскага.

«Ілюстраваны кур'ер цодзенны» паведамляе, што арыштаваныя будуць адказваць перад ваенна-палявым судом. Пагражае ім кара сьмерцю.

Варшава не застаецца ў баку

ВАРШАВА, 8. (ТАСС). Афіцыяльна апублікавана распараджэньне ўраду аб увядзеньні стопроцантнага павышэньня мыт на тлушчы замежнага паходжаньня: сала сырое і таплёнае і маргарын. Гэта распараджэньне адпавядае настойлівым патрабаваньням польскіх гаспадарчых колаў.

Тав. ЗЛІЗАРОВІЧ (Мішка)

Недарэчны выпадак вырваў з нашых радоў эмакара-бальшавіка і лепшага таварыша Мішку.

Член партыі з 1919 году тав. Мішка працаваў у падпольлі ЗБ да прыходу Чырвонай арміі. Потым тав. Мішка працаваў членам роўкому, сакратаром Чрэзвычайкома РВС у Менску і Смаленску, нам. дырэктара СГС Наркамзему, даверапы праўленьня Лесбелу ў Крыме, а ў апошні час у ЦК КП(б)Б.

Тав. Мішка на ўсіх пастох партыйнай работы быў дысцыплінаваным партыйцам, сваю адказную работу выконваў з адданасьцю, замілавальнем і веданьнем справы. Шматгадовая цяжкая праца падарвала яго здароўе.

Ня гледзячы на хранічную хваробу, на цяжкі стан здароўя, тав. Мішка, пастаянна завалены работай, не знаходзіў ні хвіліны для сябе, для адпачынку, працаваў з энтузіязмам звыш сваіх сіл, заахвочваючы да работы ўсіх таварышоў, што працавалі з ім.

Тав. Мішка, які самаахвярна працаваў у партыі, застаўся ў нашай памяці, як прыклад адданага партыйца і адзыўнага таварыша.

Група таварышоў.

Усебеларуская партнарада па мастацтве

МАСТАЦТВА--НА СЛУЖБУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

Усебеларуская партыйная нарада па пытаньнях мастацтва распачала сваю работу пры нерапоўненай залі рабочымі, чырвонаармейцамі, акторамі і г. д. Гэта ўвага да работы нарады падкрэсьлівае вялізарную зацікаўленасьць шырокіх пластоў працоўных пытаньнямі далейшай барацьбы на адным з важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва — на фронце **мастацтва.**

Удзел у работах нарады пралетарскай грамадзкасьці паказвае, наколькі востра стаяць пытаньні барацьбы за стварэньне нацыянальнага па форме і пралетарскага па зьмесьце мастацтва, наколькі вырасьлі патрабаваньні рабочага да тэатру, музыкі, кіно і г. д.

У шматлікіх прывітаньнях і рапартах, якія заслухала нарада, вельмі настойліва гучэлі патрабаваньні з боку пралетарскай грамадзкасьці да мастацтва. Фронт мастацтва ня можа адставаць ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, тэатры, кіно сваёй работай павінны змагацца за няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Дэлегацыі заводаў мастацтву высунулі сустрэчны рахунак, які павінен быць аплочан высока мастацкімі пралетарскімі пастаноўкамі, музыкай, кіно-фільмамі, песьнямі, вартымі гераічнага змаганьня пралетарыяту.

Ва ўступнай прамове загадчык культпропу ЦК КП(б)Б тав. **Чарнушэвіч** адзначыў, што партыя ставіць надзвычай вялікія і адказныя задачы перад мастацтвам, што вырашэньне гэтых задач павінна праходзіць у непрымірымым змаганьні з клясава-варожымі плынямі на ідэалёгічным фронце, у набліжэньні ўсяго мастацтва да рабочага глядача і слухача, у перабудове ўсяго мастацкага фронту ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай, новымі ўмовамі работы.

— Перад нашай нарадай, — гаворыць тав. Чарнушэвіч,—стаяць перш за ўсё задачы па падагульваньні работы ўсіх галін мастацтва за прайшоўшыя гады, па выяўленьні недахопаў, якія ёсьць на гэтым фронце з тым, каб больш выразна і правільна намеціць далейшыя шляхі разьвіцьця пралетарскага мастацтва.

Гэта задача можа быць выканана толькі пры ўмове, калі мы ўлічым асабліваасьці сучаснага пэрыяду, калі зразумеем, што мастацтва зьяўляецца вострай зброяй барацьбы з клясавым ворагам, зброяй барацьбы за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Сьпяшаючыся на вялізарных дасягненьнях, да якіх прышлі працоўныя БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, тав. Чарнушэвіч завастрае ўвагу па неабходнасьці разгортваньня самай рашучай і бязьлітаснай барацьбы з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму, нацдэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў.

— Мы назіраем, — падкрэсьлівае тав. Чарнушэвіч, — актывізацыю ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму і на фронце культуры і мастацтва. Асабліва зараз, калі мы праводзячы жорсткую барацьбу з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, некалькі аслабілі ўвагу да пытаньняў барацьбы з вялікадзяржаўным ухілам, актывізацыя расійскіх шавіністаў зьяўляецца відавочным фактам. Ухіл у бок вялікадзяржаўнага шавінізму на фронце мастацтва праяўляецца ў першую чаргу ў спробах адмаўленьня паяўнасьці беларускай культуры, нацыянальнага пралетарскага мастацтва, у імкненьнях давесьці немагчымасьць разьвіцьця беларускай пралетарскай культуры.

Тав. Чарнушэвіч у сваёй прамове аддае шмат увагі становішчу буржуазнага мастацтва, прыводзіць шматлікія факты аб патухаючай крывой мастацтва ў капіталістычных краінах. І ў сувязі з гэтым падрабязна спыняецца на так званай «тэорыі» па-за клясавага мастацтва.

— Ідэолёгі буржуазіі расьпінаюцца аб тым, што мастацтва зьяўляецца бясклясавым, што яно ня мае ніякіх прымет клясавай барацьбы. Ленін і наша партыя ня раз падкрэсьлівалі, што **мастацтва зьяўляецца клясавым,** што яно ёсьць **зброя ў руках пануючай клясы.**

Мы з усёй рашучасьцю патрабуем ад мастацтва, каб яно было **клясава-вытрыманым,** каб яно **дапамагала** будаўніцтву сацыялізму, каб яно было **зброяй** у руках пралетарыяту ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

* * *

Тав. **Платун** у сваім дакладзе аб задачах мастацтва ў рэканструкцыйны пэрыяд падрабязна спыніўся на пытаньнях барацьбы КП(б)Б за стварэньне пралетарскага мастацтва, прааналізаваў работу тэатраў, Белдзяржкіно і асаблівую ўвагу зьвярнуў дэлегатаў нарады на неабходнасьць шырокага разгортваньня самадзейнага мастацтва.

* * *

На ранішнім пасяджэньні 8-га сьнежня нарада заслухала рапарт аўторскага калектыву БДТ-2.

З вялікім дакладам выступіў прадстаўнік Камуністычнай Акадэміі СССР, рэдактар часопісі «Литература и искусство» тав. Дзінамаў аб «Лісьце тав. Сталіна і задачах тэарытычнага фронту мастацтва».

Потым нарада заслухала даклад тав. **Гурскага** аб задачах плянаваньня мастацтва ў БССР.

На вячэрнім пасяджэньні газгарнуліся спрэчкі па дакладах т.т. Платуна, Дзінамава і Гурскага.

Дэкада Ўсесаюзнай Камуністычнай Акадэміі ў БССР

За больш цесную сувязь з цэнтрам марксыцкай навукі СССР

(Гутарка з прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук тав. П. Горным)

Дэкада Ўсесаюзнай Камуністычнай Акадэміі ў БССР мае для нас выключнае значэньне. Яна кладзе асновы для ўстанаўленьня пастаяннага і шчыльнага супрацоўніцтва Беларускай Акадэміі з Камуністычнай Акадэміяй, як ЦЭНТРАМ МАРКСЫЦКАЙ НАВУКІ СССР. Бяз самай шчыльнай сувязі з іншымі марксыцкімі ўстановамі нашага Саюзу, і ў першую чаргу з Камакадэміяй, нельга справіцца з задачамі марксыцкай распрацоўкі пытаньняў, што стаяць перад намі.

Адрыў і адсутнасьць сувязі ў працы навуковых работнікаў БССР з навуковымі ўстановамі іншых частак нашага Саюзу паглыбляюць адставаньне навуковай думкі ў БССР.

Дэкада Камакадэміі зьяўляецца вялікім крокам у ліквідацыі элемэнтаў бясплянавасьці працы нашых навуковых устаноў, мае буйнейшае палітычнае значэньне для разьвіцьця навукі ў БССР. Дэкада — буйнейшы фактар інтэрнацыянальнага выхаваньня мас. Без далейшай рашучай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, з вялікадзяржаўным ухілам, як галоўнай небясьпекай, і без барацьбы з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і ўхілам у бок беларускага шавінізму мы ня зможам разгортваць наша сацыялістычнае будаўніцтва.

Тав. СТАЛІН у сваім апошнім артыкуле «АБ НЕКАТОРЫХ ПЫТАНЬНЯХ ГІСТОРЫІ БАЛЬШАВІЗМУ» з усёй вострасьцю ставіць пытаньне аб бязьлітаснай барацьбе з усякімі спробамі рэвізіі бальшавіцкай рэвалюцыйнай тэорыі і падкрэсьлівае недапушчальнасьць праяўленьня «гнілога лібэралізму» да нашых ворагаў. Гэты напамінак тав. Сталіна ў аднолькавай меры адносіцца і да нашай барацьбы за ленінскае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі.

Вялізарная важнасьць дэкады Камакадэміі заключаецца яшчэ ў тым, што тэматыка дакладаў датычыць асноўных праблем нашага сацыялістычнага будаўніцтва і ставіць сваёй задачай аднаёміць працоўных БССР з тэй барацьбой, якую вядзе партыя ў галіне тэорыі, эканомікі, філёзофіі, гісторыі, савецкага будаўніцтва, права, прыродазнаўства і г. д

Мы абавязаны дабіцца таго, каб дэкада Камакадэміі стала здабыткам найшырэйшых працоўных мас і была шырока выкарыстана для нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

(БЕЛТА).

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68)
Сёньня, 9-га сьнежня, у 6 гадзін вечара адбудзецца
СПАТКАНЬНЕ
савецкіх пісьменьнікаў г. Менску з прадстаўнікамі Камуністычнай Акадэміі СССР
Выступаюць т. т. С. ДЫНАМАЎ і Л. ЛІБЯДЗІНСКІ.
Запрашаюцца члены літаратурных гурткоў МопАПП'у, пісьменьнікі, мастакі, кампазытары.
Уваход вольны.

Паведамленьні

— 9-га сьнежня, г. г. у 6 гадз. вечара, у памяшканьні залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)Б склікаецца нарада сакратароў усіх партколектываў і ячэек КП(б)Б і кіраўнікоў (камуністаў) культурных устаноў гор. Менску. Парадак дня: 1. Прэзыдыюм лёста тав. Сталіна у радыёцыю часопісі «Пралетарская рэвалюцыя» — «Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму»; 2. Аб дакладніку Камуністычнай Акадэміі Яўка сакратароў партколектываў і ячэек КП(б)Б і запрошаных кіраўнікоў (камуністаў) культурных устаноў гораду — **абавязкова.**

— **Менгарком КП(б)Б, Гарпрафсавет і аргбюро т-ва «Прыхільнік радыё»** 10 сьнежня, у 7 гадз. веч., у Доме навукі і тэхнікі склікаюць канфэрэнцыю таварыства з парадкам дня: 1) Аб культурнай рэвалюцыі. 2) Выкананьне плану радыёфікацыі і плян на 1932 г. 3) Выбары кіруючых органаў. Сакратарам партколектываў і ячэек КП(б)Б, фабзаўмясцкомам забясьпечыць яўку дэлегатаў. Білеты атрымаць з 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня па Ленінскай, 16.

— Сёньня, 9 сьнежня, у 7 гадз. вечара, у Камвузе адбудзецца агульны сход фракцыі таварыства гісторыкаў-марксыстаў. Парадак дня: абгаварэньне лёста тав. Сталіна.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

10-га сьнежня роўна ў 7 гадзін веч. у памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету (пляц Волі, 4, 3-ці паверх)
АДБУДЗЕЦЦА
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНГАРСАВЕТУ.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Плян разьвіцьця гарадзкой камунальнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва на 1932 г. 2) Рознае.
Яўка членаў і кандыдатаў гарсавету абавязкова. Запрашаюцца прымацаваныя і дэлегатні.

КІНО **ПРАЛЕТАРЫ**
Толькі 3 дні *8, 9 і 10 сьнежня*
ТАНІ-ЮН
— у мастацкім фільме —
АПАЙКА драма ў 6 част.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ **хроніка Саюзкіно**
Пачатак дзённых сэансаў у 2 гадз., 3-30
» вячэрніх » у 7, 8-30, 9 і 10-30
Каса адкрыта з 12 гадз. дня

Чыр. Зорка Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30	Гуцаны спартыўны фільм *ЧЫРВОНЫ СПОРТ* Гукавы фільм—ТУРКСІБ
КУЛЬТУРА Пач.: 7, 8-40 і 10-20	У краіне звалаў кіно-п'еса у 6 ч. з пралёгам АЛІМПІЯДА БАЛТФЛЕТУ
Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня	Усходні мастацкі фільм ЗАРЭ КІНО-НАРЫС САЮЗКІНО
„Юны Піянэр“ (Будынак кіно „Культура“)	Мастацкі фільм ПАРТФОЛЬ ДЫЦКУР'ЕРА Звыш прагр.—хроніка. Пач. 1-е, 2-30. Каса—ад 11 г. ран.
„СПАРТАК“ К яса адкр. з 5 г.	НІНІШ у 8 част. У галоўн. ролі ОСІ АСВАЛЬД. Пачатак сэансаў: 7, 9 і 10-45 м.

ГАРІНСПЭКТУРА АСЬВЕТЫ
паведамляе аб тым, што
ДАШКОЛЬНЫЯ 6-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ
пачынаюць працаваць 10|XII у 5 з пал. гадз. веч. (Савецкая, 144, пакой № 8), куды і павінны зьявіцца ўсе падаўшыя заявы.
У сувязі з адкрыцьцём яшчэ адной групы, на курсах прыём заяў працягваецца.

Беларускі дзяржаўны інстытут удасканаленьня мэдычных кадраў
ЦЫКЛЬ ЛЕКЦЫЙ
для дактароў г. Менску на **СЬНЕЖАНЬ** месяц.
10|XII—праф. **Сакалоўскі М. П.** на тэму: „Рэзэкцыя жаўлудка як спосаб лячэньня язвы жалудка“.
20|XII—дац. **Шапіра М. Н.** на тэму: „Функцыянальнае захаваньне храсьціцы“
30|XII—дац. **Сітэрман Л. Я.** на тэму: „Нэўрозы серца і іх лячэньне“
Лекцыі будуць адбывацца ў аўдыторыі клінікі нэрвовых хвароб у 8 гадз. веч.
Дырэкцыя Інстытуту.

УСІМ прынятым курсантам
КУРСЫ тэхнікаў-эканамістаў
па прасоўваньні фільм прапануецца зьявіцца на заняткі 10 сьнежня, у 6 гадз., у памяшк. Белдзяржкіно, Савецкая, 90,
Адміністрацыя.

На падставе дазволу Наркамтпраці БССР ад 5-XII-31 г. за № 131-5-12,
Беларускае аддзяленьне лесаснабзбыту
з 6 сьнежня перайдзе
на шасьцідзённы перапынны тыдзень
з устанаўленьнем адзінага выходнага дня ў наступныя дні: 6, 12, 18, 24 і 30 кожнага месяца, а ў канцы лютага—1 сакавіка.
У выходныя дні ў аддзяленьні лесаснабзбыту будуць дзяжурыць адзіныя супрацоўнікі.

ТВМДБ
10 сьнежня, у 7 гадз. веч., у інстытуце філёзофіі БАН адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД ТВМДБ
з парадкам дня: ліст т. Сталіна ў рэд. часопісі «Пралетарская рэвалюцыя» і задачы ТВМДБ.
Прысутнасьць членаў ТВМДБ і членаў ячэек сацзейчаньня ТВМДБ ва прадпрыемствах абавязкова.
Праўленьне

10 сьнежня г. г., у 6 гадз. веч., у памяшк. клюбу імя Карла Маркса адбудзецца
МАСАВЫ ВЕЧАР
сакратароў ячэек Асоавіяхіму, нач. складу запасу, атрадаў хэмнамаанд.
Запрашальныя білеты ў Гарсавеце Асоавіяхіму можна атрымаць штодзённа з 11 гадз. раніцы да 6 гадз. вечара.
Менгарсавет Асоавіяхіму.

Супрацоўнікі цэнтральнай хэмічнай лабараторыі Наркамснабу выказваюць сваё глыбокае спачуваньне т. МІЦЕЛЬМАНУ з прычыны дачаснай **сьмерці яго жонкі.**

Бюро партыйнага калектыву, заводзкі камітэт і заводкіраўніцтва гарбарні «Бальшавік» выказваюць сваё глыбокае спачуваньне дырэктару заводу т. БОНДАРЧЫКУ з прычыны **сьмерці яго бацькі.**

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР БСРР
— адбудзецца —
10-га сьнежня, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні ЦК МОПР'у
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Справаздача заўкому МОПР'у зав. „Польмя Рэвалюцыі“ аб праводзімай масава-выхаваўчай рабоце сярод рабочых. 2. Інфармацыі Менскага, Магілёўскага, Гарадзенскага, Барысаўскага, Жлобінскага і Быхаўскага РК МОПР'у аб work месячніка мабілізацыі сродкаў. Вынікі скарыстаньня Аўстрыйскай дэлегацыі па БССР. 4. Даклад аб рабоце газэты „МОПР“. 5. Аб рабоце Беларускага інтэрфаку МОПР. 6. Аб 4-м пленуме ЦК МОПР'у БССР.
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і рэвізійнай камісіі ЦК МОПР'у абавязкова.
Запрашаецца гарадзкі МОПР-актыў.
Просьба зьявіцца прадстаўнікам тых раёнаў, інфармацыі якіх пастаўлены на прэзыдыуме.
Сакратар ЦК МОПР'у БССР ЦУДЗІН.

Рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА“ патрэбна *вопытная* **машыністка,** якая добра ведае беларускую мову.

Беларускае аддзяленьне кнігагандлю „ОГИЗ РСФСР“
АДКРЫЎСЯ АДДЗЕЛ
„КНІГА-СПАЖЫЎЦУ“.
Пры заказе ўсякая кніга, ЯКАЯ ЁСЬЦЬ НА КНІЖНЫМ РЫНКУ ў аднадзенны тэрмін будзе выслана накладной платай
ЗАКАЗЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСЕ:
МЕНСК, „КНІГА-СПАЖЫЎЦУ“

Менск. друкарня газ. «ЗЬВЯЗДА».